Александр ЛУКАШЕНКО:

«Запад должен помочь Беларуси остаться свободным и независимым государством»

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№№143–144 (2871–2872)

25 верасня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Беларускі транзіт

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес плануе наведаць Беларусь. Пра гэта паведамляе лацінаамерыканскае агенцтва навін "Прэнса Лаціна".

Візіт Чавеса ў Кітай пачаўся ў аўторак, 23 верасня. Пасля Пекіна Чавес наведае Расію і Беларусь, а затым Францыю і Партугалію, паведамляе "Прэнса Лаціна". "Асноўнай мэтай гэтага туру з'яўляецца пашырэнне двухбаковых сувязяў і падпісанне пагадненняў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сферах, а таксама пашырэнне палітычнага дыялогу па міжнародных пытаннях, што ўяўляюць узаемную цікавасць", — зазначае агенцтва.

Нагадаем, Уга Чавес ужо тройчы наведваў Беларусь — у ліпені 2006-га, у чэрвені 2007-га і ў ліпені 2008 года.

Аляксандр Казулін застаецца сярод тых, хто прэтэндуе на атрыманне прэміі імя Андрэя Сахарава

Камітэты па пытаннях замежных спраў і па пытаннях развіцця Еўрапарламента з пададзенага спісу вылучэнцаў абралі толькі траіх прэтэндэнтаў на прэмію імя Андрэя Сахарава.

Прэтэндэнтамі на прэмію Сахарава застаюцца, у прыватнасці, былы беларускі палітвязень Аляксандр Казулін, кітайская праваабаронца і барацьбітка за абарону навакольнага асяроддзя і супраць СНІДу Ху Джыа, а таксама кіраўнік незалежнай выбарчай камісіі Дэмакратычнай Рэспублікі Конга Абаат Малу Малу. Прозвішча лаўрэата стане вядома ў кастрычніку. Цырымонія ўручэння прэміі адбудзецца 17 снежня на пасяджэнні Еўрапарламента ў Страсбургу.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Ночь чудесных обманов

В ночь с субботы на воскресенье, вознамерившись двинуться за грибами хотя бы в шесть, я пробудился где-то во втором, может быть, в третьем часу.

Все лето о грибах ходили разные слухи, мой же собственный опыт был крайне неудачен и скуп. А тут, в самую непогоду, пошло-поехало — один приятель набрал два ведра боровиков, другой столько же красноголовиков, дав повод отшутиться в том духе, что красноголовиков у нас в любую пору года хватает...

В общем, мысли о грибах не давали уснуть, и я включил телевизор. Выступал Александр Григорьевич Лукашенко...

Как все-таки все изменилось!

У Иосифа Виссарионовича Сталина (Джугашвили) телевизора не было, и это оборачивалось бессонными ночами совслужащих, с благоговением и страхом ждущих, что еще скажет вождь, страдающий неусыпным бдением о благе народа.

Нынешним вождям, да и нам, слава Богу, можно спать спокойно. Все, что надо, сделает телевизор — и покажет, и скажет. Хоть солнечным летним утром, хоть в глухую осеннюю ночь.

Надо сказать, что накануне, отправляясь пораньше спать, я избежал пытки "Большой политикой" и ее ведущим, сопровождающим посвящение в "тайны" многозначительным прищуром провинциального конферансье. Удалось отдохнуть и от пламенной публицистики нескончаемой "Панорамы", поддержав тем самым здоровое состояние духа, грибного в особенности...

Но тут, увидев посреди ночи главу государства, я, конечно, забыл о грибах и стал внимательно слушать. Тем более что говорил Лукашенко о парламентских выборах, до которых оставалась всего неделя, а я так и не ответил на вопрос внучки, за кого буду, и буду ли, голосовать. К концу монолога мне показалось, что Александр Григорьевич окончательно запутал все, что отчаянно, каждый в своем духе, пытались распутать кандидаты от оппозиции, журналисты, западные в том числе, наблюдатели, а также госпожа Ермошина в своей неподражаемой, можно сказать, эксклюзивной манере.

В общем, чем внимательней я слушал, тем хуже получалось что-либо понимать.

Ну как, скажите, понять такую замысловатую "загогулину"? С одной стороны, утверждает Лукашенко, избирательная кампания проходит в полном соответствии с законами и Конституцией страны, а с другой — *"мы сплошь нарушаем законы и ведем выборы по понятиям Запада и ОБСЕ"*. Если бы я был в числе журналистов, тянущих к президенту микрофоны и диктофоны, я обязательно спросил бы у него, чем объяснить столь чудесное сосуществование несовместимого и нет ли тут повода для самоотверженных прокурорских инициатив.

Если бы я был в числе тех журналистов, я обязательно спросил бы, почему у нас нет парламентской оппозиции, без которой "понятия Запада и ОБСЕ" о демократии просто немыслимы. Речь, понятно, не о "крикунах", по нашим отечественным понятиям, и не о всяких там инакомыслящих диссидентах, а о партии или коалиции партий, предлагающих обществу альтернативный проект, обладающих реальным влиянием на законотворчество и власть. А может, известен в означенных пределах и даже далеко за ними хоть один парламент без оппозиции?

Тогда что мы выбираем?

Александр Лукашенко, правда, уверяет, что оппозиции у нас с гулькин нос, "в рамках арифметической погрешности". Тут, конечно, ему виднее. Но я не удержался бы от вопроса: а кто осуществил в нашей стране такую чудесную трансформацию, включая пресловутую безработицу оппозиционеров?..

Еще я обязательно уточнил бы, что имеет в виду Александр Григорьевич, грозя Западу прекращением разговора. Разговора о чем? О либерализации? Выходит, Западу эта самая наша либерализация нужнее, чем нам самим?

С этим Западом вообще получаются сплошные непонятки, если применить к нему президентскую логику. Вот-де у нас *"...выборы идут спокойно. Это говорит о том, что наше общество здорово и этой власти люди доверяют"*. Выходит, в странах Запада, где власть меняется с обусловленной политическими системами регулярностью, общество нездорово и никакого спокойствия нет?

На Западе я не жил, в ихних выборах не участвовал, но почему-то сдается мне, что все как раз наоборот. Народ там, известно, живет неплохо, даже куда лучше нашего, но, тем не менее, с большой охотой и интересом пользуется возможностью поменять власть, если того захочет. И власть, что более всего удивительно, если и сопротивляется, то в дебатах, на митингах и возле избирательных урн...

Ну и последнее, о чем я обязательно спросил бы у президента: что у нас в стране вообще называется выборами? Если то, что я думаю, так это в лучшем случае называется голосованием. Что, как подсказывает изрядно прожитая жизнь, далеко не одно и то же.

Очень далеко...

kamerton_41@mail.ru

Яраслаў Берніковіч звярнуўся з адкрытым лістом да Уладзіміра Андрэйчанкі

Член Партыі БНФ, кандыдат у дэпутаты па Глыбоцкай выбарчай акрузе Яраслаў Берніковіч распаўсюдзіў адкрыты ліст, адрасаваны старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзіміру Андрэйчанку, які балатуецца па той жа акрузе. Апазіцыйны палітык прапануе кандыдату ад улады добраахвотна адмовіцца ад удзелу ў выбарах. Прапануем вашай увазе поўны тэкст адкрытага ліста Яраслава Берніковіча.

АДКРЫТЫ ЛІСТ

Старшыні
Віцебскага аблвыканкама,
кандыдату ў дэпутаты
Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу РБ
4-га склікання
У.П.Андрэйчанку

Шаноўны Уладзімір Паўлавіч!

Як жыхар Віцебшчыны, я вельмі паважаю Вас за тое, што шмат гадоў Вы выконваеце нялёгкую працу на пасадзе старшыні аблвыканкама. Я разумею, што ў краіне з праблемным станам эканомікі, абвостранымі сацыяльнымі пытаннямі, занядбанням нацыянальнай мовы і культуры дужа складана несці адказнасць за паказчыкі развіцця вобласці перад вышэйшым кіраўніцтвам. І нашмат цяжэй адчуваць адказнасць за тыя недахопы, якімі не прынята хваліцца перад звычайнымі людзьмі, нашымі з Вамі землякамі.

Мушу прызнацца, што Ваша рашэнне балатавацца па Глыбоцкай выбарчай акрузе №22, маёй малой радзіме, было для мяне нечаканым: наколькі мне вядома, Вас з гэтымі мясцінамі нічога не звязвае. І таму падчас кампаніі па зборы подпісаў мае патэнцыйныя выбаршчыкі неаднаразова казалі мне, што амаль не ведаюць Вас — хіба толькі Ваша прозвішча і пасаду, і дзівіліся, чаму менавіта гэты рэгіён Вы абралі "стартавай пляцоўкай" у дэпутаты парламента.

Цяпер, калі да заканчэння выбарчай кампаніі засталося некалькі дзён, людзі гавораць іншае: яны ўбачылі, як так званы "адміністрацыйны рэсурс" выкарыстоўваецца для агітацыі, і абураныя тым грубым ціскам, які аказваецца на іхную свядомасць з мэтаю папулярызаваць Вас і Вашу дзейнасць. Мае патэнцыйныя выбаршчыкі паведамілі мне шэраг фактаў, кожны з якіх з'яўляецца парушэннем Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь. І я лічу неабходным паведаміць Вам, што мной складзены тры заявы ў акруговую выбарчую камісію з патрабаваннем адмяніць рашэнне аб Вашай рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання.

У прыватнасці, парушэннем выбарчага заканадаўства я лічу тое, што супрацоўнікі пошты разносяць Вашы агітацыйныя ўлёткі, раскладваючы іх па паштовых скрынях разам з газетамі. Вашы агітацыйныя плакаты бесперашкодна размяшчаюць ва ўсіх установах і прадпрыемствах, тады як для іншых кандыдатаў *"на гэта няма дазволу"* — менавіта так мне адказалі ў кіёску "Белсаюздрук" г.Глыбокае. Асобна хачу адзначыць тое, што лічу недапушчальнай ускосную агітацыю ў рэгіянальных газетах "Веснік Глыбоччыны" (Глыбокае), "Родныя вытокі" (Докшыцы), "Патрыёт" (Ушачы), "Народнае слова" (Віцебск), "Віцебскі рабочы" (Віцебск), якія з нумара ў нумар друкуюць матэрыялы пра Ваш удзел у тых ці іншых мерапрыемствах на тэрыторыі акругі.

Згаданыя вышэй факты сведчаць таксама і пра парушэнне з Вашага боку прынцыпу роўнасці для ўсіх кандыдатаў, прадугледжанага Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Таму, звярнуўшыся папярэдне ў акруговую выбарчую камісію, я звяртаюся і да Вас, шаноўны Уладзімір Паўлавіч, з прапановай добраахвотна адмовіцца ад удзелу ў выбарах. Я перакананы, што ў такім выпадку выбаршчыкі высока ацэняць Вашу прынцыповасць, павагу да законаў Рэспублікі Беларусь, і на пасадзе старшыні Віцебскага аблвыканкама Вы знойдзеце яшчэ больш прыхільнікаў, чым было дагэтуль.

Яраслаў БЕРНІКОВІЧ,
кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ 4-га склікання па Глыбоцкай выбарчай акрузе №22.

Федор Повный отказался от сенаторства

Председатель правления Департамента внешних связей Белорусского Экзархата, настоятель минского Храма в честь Всех Святых протоиерей Федор Повный, выдвинутый кандидатом в члены Совета Республики от города Минска, не дал согласие избираться в верхнюю палату белорусского парламента.

О ситуации, которая сложилась вокруг выдвижения в сенаторы протоиерея Федора Повного, мы подробно рассказывали в одном из предыдущих номеров "Народной воли". Священнослужитель был выдвинут на сенаторскую должность на совместном заседании Мингорсовета и Мингорисполкома. Однако, согласно канонам православной церкви, участие священнослужителя в выборах любых органов власти, будь то на общегосударственном уровне или даже местном, считается нежелательным, представитель церкви, получив государственную должность, может быть лишен сана.

Буквально на следующий день после нашей публикации некоторые информационные агентства, ссылаясь на протоиерея, распространили новость, что выдвижение кандидата в сенаторы Федора Повного проходило без его согласия. А чуть позже официальное сообщение пришло из Центризбиркома: Федор Повный снимает свою кандидатуру. Секретарь ЦИК Николай Лозовик уточнил, что, по словам отца Федора, свое решение он принял после визита в Москву и встречи с главой Русской православной церкви Алексием Вторым.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Выбары за калючым дротам

Каля 13 тысяч чалавек, змешчаных ва ўстановы пенітэнцыярнай сістэмы Беларусі, змогуць прагаласаваць на выбарах.

Гэта каля 1400 чалавек, змешчаных цяпер пад арышт, каля 3 тысяч чалавек, змешчаных у лячэбна-працоўныя прафілакторыі (ЛПП), а таксама больш за 8 тысяч чалавек, які адбываюць пакаранне ў папраўчых установах адкрытага тыпу, адзначае "Інтэрфакс".

Кадэбісты лічаць перадвыбарную праграму Мілінкевіча экстрэмісцкай

І хочуць, каб гэта афіцыйна пацвердзіў суд. Менавіта ў суд гродзенскія чэкісты перадалі дакументы, канфіскаваныя ў розных людзей на дзяржаўнай мяжы ў перыяд з 2005-га па 2007 год. Сярод матэрыялаў, якія чэкісты лічаць экстрэмісцкімі, побач з "Хронікай парушэння правоў чалавека", відэазапісам варшаўскага канцэрта "Салідарныя з Беларуссю" апынулася і прэзідэнцкая перадвыбарная праграма Аляксандра Мілінкевіча. Два гады таму кампакт-дыск з ёй канфіскавалі на беларуска-польскай мяжы ў жыхара вёскі Новая Вергань Іўеўскага раёна Гродзеншчыны Дзмітрыя Ёдкі.

Спадар Ёдка вяртаўся з паездкі ў Польшчу. У гэты ж самы час перад памежным пераходам Кузніца-Брузгі праходзіў пікет актывістаў польскай арганізацыі "Вольная Беларусь". У іх Зміцер (проста з цікавасці) і ўзяў кампакт-дыск з праграмай Мілінкевіча. Калі беларускія памежнікі і мытнікі запыталі Ёдку, ці давалі яму што пікетоўцы, той шчыра прызнаўся. На яго склалі пратакол, канфіскавалі дыск, і хлопец паехаў далей. Ён ужо паспеў забыць пра той выпадак, але днямі атрымаў позву з патрабаваннем з'явіцца ў суд адказчыкам па грамадзянскай справе.

Аляксандр Мілінкевіч гаворыць:

— Магчыма, ёсць такія сілы, якія ўвесь час хацелі, каб было напружанне паміж Еўропай і Беларуссю. Бо калі зараз успамінаць, што было ў 2006 годзе — усе праграмы былі друкаваныя і распаўсюджваліся. І тут раптам нешта ўзнікае. Гэта і сумна, і смешна.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ.

ПАЗІЦЫЯ

Былым дэпутатам няма чаго рабіць у парламенце

У "Народнай волі" за 19 верасня прачытаў заметку Вольгі Гаркун "За што іх выбіраць?". Згодзен з ёю на сто працэнтаў. Сапраўды, за што яшчэ раз выбіраць у парламент тых, хто не падняў ні прэстыж краіны, ні дабрабыт людзей? Калі б не іх маўклівая згода, не іх патуранне, Аляксандр Лукашэнка даўно б задумаўся над памылкамі сваёй палітыкі, над тым, што нельга дзеля ўтрымання ўлады, дзеля асабістых карысных інтарэсаў ігнараваць цывілізаваныя нормы дзяржаўнага будаўніцтва. Якім бы разумным адзін чалавек ні быў, не можа і не мае права ўзяць ён усё на сябе. І тут дэпутаты Палаты прадстаўнікоў даўно павінны былі сказаць сваё слова. А яны паводзілі сябе, прабачце за прамалінейнае параўнанне, як мышы пад венікам.

А якую ініцыятыву праявілі так званыя палатнікі пры распрацоўцы законаў? У прэсе прайшла інфармацыя, што амаль усе праекты законаў рыхтаваліся паза сценамі парламента. Калі так, то я не хачу бачыць у вышэйшым заканадаўчым органе нікога з тых, хто там адсядзеў чатыры, а то і восем ці дванаццаць гадоў. Хопіць быць нахлебнікамі ў падаткаплацельшчыкаў!

Дарэчы, я здзівіўся тым лічбам, якія нядаўна абнародавала "Комсомольская правда" в Белоруссии". Вось цытата: *"Парламентарыі ў мінулым годзе атрымлівалі каля 3,5 мільёна рублёў у месяц (каля 42 мільёнаў за год). Старшыні парламенцкіх камісій — болей, да таго ж некаторыя дэпутаты, якія дасягнулі адпаведнага ўзросту, лічацца працуючымі пенсіянерамі — таксама прыбаўка да зарплаты. Амаль кожны трэці дэпутат сённяшняга парламента хоча захаваць свой даход і працягнуць працу ў Палаце прадстаўнікоў.*

Дэпутат Ніна Федарук, якая зноў ідзе на выбары, атрымала за мінулы год 48,5 мільёна рублёў, дэпутат Вольга Абрамава — 41 мільён. Каля 42 мільёнаў за год зарабіла ў Авальнай зале дэпутат Таццяна Голубева..."

Лічбы, як кажуць, унушальныя. Але нават не ў іх справа. Няхай бы прыбытак той жа камуністкі Таццяны Голубевай быў і большым, калі б, скажам, яна з імпэтам адстойвала інтарэсы людзей. А то... Падчас галасавання па пытанні аб пазбаўленні льгот яна ціснула кнопку так, як і ўсе астатнія. Нідзе я не чытаў і ніколі не чуў, каб яна вызначылася прынцыповасцю і тады, калі разглядаліся праекты іншых лёсавызначальных законаў. Ды і як яна можа вызначыцца, калі з'яўляецца членам Кампартыі Беларусі, якая, можна сказаць, на каленях поўзае перад Лукашэнкам? Міжволі ўзнікае пытанне: сапраўды, за што такіх людзей зноў выбіраць дэпутатамі вышэйшага заканадаўчага органа?

Барыс АПАНАСЕНКА,
выбаршчык, 59 гадоў.

АД РЭДАКЦЫІ

Звесткі аб сукупных даходах кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў маюцца ў акруговых камісіях. Вядома, улічваюцца даходы як па асноўнай рабоце, так, магчыма, і па дадатковай, а таксама ад продажу, напрыклад, машыны ці нейкай іншай маёмасці.

Севярынца не хочуць бачыць на выбарах?

Сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская Хрысціянская дэмакратыя" Павел Севярынец не атрымаў запрашэння на ўдзел у выбарах.

Бацькам Паўла, якія прапісаныя з ім па адным адрасе, запрашэнні былі ўручаны, а на пытанне "Дзе запрашэнне на сына?" супрацоўнікі выбарчай камісіі толькі пацісналі плячыма і адказалі: "Такога няма".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ПОРТРЕТНАЯ ГАЛЕРЕЯ

Анна ГОТОВЕЦ, кандидат в депутаты Палаты представителей:

«Признать Лукашенко почетным президентом Беларуси и отправить на отдых»

Бобруйск — город, ставший притчей во языцех — известная правозащитница, медицинский работник, кандидат в депутаты **Анна Михайловна Готовец** знает как пять своих пальцев. В каких подъездах протекают крыши, в каких дворах не положен асфальт, в каких квартирах жильцы не могут добиться капремонта.

Анна Михайловна признает: Бобруйск заметно изменился за последние годы. Нет больше унылого, вгоняющего в депрессию здания вокзала, где раньше негде было выпить даже чашку кофе. Преобразилась и вся привокзальная площадь. А стильные молодежные граффити — симпатичный бобр и надпись "Город назвали в честь меня", нанесенные на стену недалеко от вокзала, исполнены патриотизма и любви к родному Бобруйску.

После "Дожинок" власти стараются здесь поддерживать порядок. Но центр города все еще контрастирует с окраинами, где многое осталось по-старому.

"В Бобруйске еще много работы для депутата", — считает Анна Готовец.

В последние годы она организовала и провела ряд семинаров, на которых бобруйчан учили добиваться от ЖКХ качественных и своевременных услуг.

"Знание горожанами своих прав и умение их отстаивать подстегнули работу жилищно-коммунальных хозяйств в городе. В результате и подъезды и улицы стали чище и аккуратней", — говорит Анна Готовец.

В родном городе ее многие знают в лицо. И зачастую принимают за действующего депутата.

"Это не случайно, что горожане идут ко мне со своими проблемами, — рассказывает Анна Михайловна. — *Мой конкурент по выборам в парламент 2004 года — директор ООО "Бобруйский машиностроительный завод" Герасимов за годы своего "депутатства" оторвался от избирателей".*

Анна Готовец говорит, что четыре года назад именно она выиграла выборы в Палату представителей. Документы, свидетельствующие о том, что окружные и районные комиссии "подогнали" итоги выборов под кандидата от власти, хранятся у нее *"до лучших времен"*. Собрала она также фамилии руководителей районных и окружных комиссий. Готовец убеждена: фальсификация выборов — преступление, у которого нет срока давности.

"В 2004 году в моем округе баллотировалось пять кандидатов. Любой человек, знакомый с избирательными технологиями, да и просто с арифметикой, знает — одержать победу в первом туре (50% плюс 1 голос) при таком раскладе невозможно. Но кандидат от власти Герасимов выиграл именно в первом туре. Мои наблюдатели присутствовали на всех 53-х участках. Осуществляли контроль за ходом голосования на каждом избирательном участке. Собрали копии протоколов. По нашим подсчетам, разница между мною и кандидатом от власти составляла 6 тысяч голосов — это значит, что второй тур был неизбежен. Однако через несколько дней из окружной комиссии пришли совсем другие цифры: разница "увеличилась" до 13 тысяч голосов, — вспоминает Анна Готовец. — *Стыдно, что кандидат от власти "победил" в первом туре. Стыдно не нам, представителям оппозиции, а тем, кто пытается "вытянуть своего" путем фальсификации выборов. В результате депутатом стал человек, которому безразличны интересы избирателей..."*

— В Украине политологи утверждают, что "оранжевая революция" была бы невозможна, если бы не фальсификации во время предыдущих избирательных кампаний. Тогда возмущение людей еще не носило массовый характер, но информация о манипуляциях в избирательных комиссиях, распространенная украинской оппозицией, постепенно накапливалась в сознании обывателей. Украинские выборы 2004 года сыграли роль детонатора... В Беларуси от выборов до выборов оппозиция перечисляет многочисленные факты, свидетельствующие о том, что голоса давно никто не считает. Но массовых акций протеста даже не прогнозируется...

— В Беларуси многие люди знают о фальсификациях. Однако у большинства это вызывает скорее чувство апатии. Во время избирательных кампаний мне часто приходится слышать от избирателей: "Я не пойду на выборы, все равно власти проголосуют так, как им надо".

На последних президентских выборах в Бобруйске наблюдатели от СНГ пропьянствовали в кабаке с местным начальством все дни досрочного голосования, день выборов и всю неделю после. А потом в газете от их имени появилась статья о том, что выборы были честными и справедливыми. Мнение других наблюдателей, компетентных и добросовестных, естественно, опубликовано не было. Газеты работают на власть. И это приносит свои, увы, нерадостные плоды... Люди, имеющие право на достоверную информацию, ее не получают.

— Как ваша команда планирует бороться с возможными фальсификациями на выборах?

— Подготовили наблюдателей... Научили их правильно оформлять заявления и акты. Конечно, трудно рассчитывать, что это поможет кардинально поменять ситуацию на осенних парламентских выборах.

Помню, в 2004 году я написала в прокуратуру и в ЦИК заявления, где перечислила множество фактов фальсификации. Однако бывшая бобруйчанка, ныне председатель Центральной комиссии по выборам Лидия Ермошина прислала мне невозмутимый ответ: "Вы проиграли..."

При встрече со мной члены окружной комиссии с тех пор опускают глаза.

Я оптимист и надеюсь, что фальсификаторы выборов будут когда-то наказаны.

— Почему оппозиция, которая все последние годы поднимала животрепещущие для многих белорусов темы, такие как отмена контрактной системы, возвращение льгот, поддерживала предпринимателей, говорила о необходимости провести референдум прежде начала строительства АЭС, так и осталась не услышана простыми белорусами?

— Для того чтобы убедить других, нужно самим жить так, чтобы одерживать пускай небольшие, но победы. Не просто декларировать те или иные принципы, а следовать им в повседневной жизни. Лично я, медицинский работник, провизор высшей категории, до сих пор работаю без контракта. Я считаю, что заключение контрактов должно быть на выгодных для работника, а не работодателя, условиях. Граждане должны знать свое право на труд и правильно пользоваться им. Сегодня я зачастую консультирую тех или иных работников, как грамотно отстоять свои права при составлении контрактов.

Есть и еще замечательные примеры. В Беларуси действует группа женщин, которые борются за свои права или же за права своих близких, осужденных по уголовным и гражданским делам. О них много писалось в электронных СМИ. Эти женщины приводили факты нарушений в ходе следствий и судов, рассказывали об условиях содержания в тюрьмах и в колониях. Сегодня власти опасаются их гораздо сильнее, чем деятельности оппозиции. Эти простые женщины, которые раньше были далеки от политики, организованно вышли на "Социальный марш" осенью 2007 года. Отстаивая свои права, они не только поддерживают друг друга, но и являются наглядной иллюстрацией того, что "благополучие", о котором твердят белорусские власти и их СМИ, шаткое и зыбкое...

Я в свою очередь поддерживаю их предложение о создании общественной комиссии по проверке деятельности прокуратуры и судов. Считаю, что свои права нужно отстаивать повседневно, каждую минуту, а не "от случая к случаю"...

На бобруйском вокзале, где проходила наша беседа (несмотря на выходной день Анна Михайловна Готовец спешила оказать правовую помощь кому-то в Осиповичах), подошел местный дизель-поезд. Из него высыпали дачники с ведрами и котомками. Время дачных заготовок для многих единственный способ не протянуть ноги зимой в "процветающей" и "благополучной" Беларуси.

Один из дачников — мужчина лет 45, слегка навеселе, услышав наш разговор, достал удостоверение ликвидатора аварии на ЧАЭС и стал жаловаться на отмену льгот и отсутствие работы.

— Про "Социальный марш" слышали? Где же вы были, когда мы добивались восстановления льгот?" — спросила кандидат в депутаты Анна Готовец.

— Так что же, под дубинки идти? — вопросом на вопрос ответил ликвидатор.

— Со мной, женщиной, не страшно и под дубинки, — невозмутимо парировала ему Анна Михайловна Готовец. — Для начала предлагаю стать членом моей инициативной группы.

Ликвидатор полез за ручкой, чтобы записать телефон кандидата в депутаты.

— "Мы, оппозиция, постоянно поднимаем глобальные проблемы и бесконечно апеллируем к Лукашенко, как бы возлагая всю ответственность на него. А нужно нести ответственность самим. Только так можно победить. В своем выступлении во время местных выборов я заявила: как медицинский работник я считаю, что над здоровьем президента нельзя издеваться. У нас есть закон об охране здоровья. В соответствии с ним я предлагаю признать Лукашенко почетным президентом Беларуси и отправить на пенсию. Он заслужил свой отдых.

А следующим президентом должна быть женщина. Так и запишите: я бы желала стать президентом. У меня есть определенное преимущество — я не замужем. А потому все свое время посвящаю людям. Жыве Беларусь!" — все так же невозмутимо продолжала излагать свою жизненную позицию Анна Михайловна.

Те, кто знаком с Анной Готовец, утверждают, что эту женщину отличает особая принципиальность. А еще потрясающее чувство юмора — редкое качество в среде белорусских политиков.

Анна Готовец родилась в Амурской области. В Беларусь переехала в 1964 году. Закончила Витебский государственный мединститут.

В 1995—2001 гг. была председателем Свободного профсоюза работников здравоохранения города Бобруйска. Член Объединенной гражданской партии. Кандидат в депутаты от Объединенных демократических сил. Считает список ОДС "списком здравомыслящих людей".

Назіральнікі АБСЕ папярэджваюць

Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ папярэджвае беларускія ўлады аб магчымасці шматразовага галасавання адных і тых жа грамадзян падчас парламенцкіх выбараў. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджаным прамежкавым дакладзе місіі назіральнікаў.

"У Беларусі спісы выбаршчыкаў складаюцца па кожным выбарчым участку, пры гэтым якога-небудзь цэнтралізаванага або зводнага спісу на любым з узроўняў вышэйшага асобна ўзятага ўчастка не існуе, — гаворыцца ў дакладзе. — Адсутнасць цэнтралізаваных звестак уліку выбаршчыкаў на агульнанацыянальным або акруговым узроўні азначае фактычную немагчымасць перакрыжаванай праверкі на прадмет выяўлення імёнаў, якія паўтараюцца".

Пры гэтым назіральнікі падкрэсліваюць, што "агітацыя па Беларусі ў цэлым вядзецца з вельмі слабой актыўнасцю", а ўсе апазіцыйныя партыі і аб'яднанні на сустрэчах з назіральнікамі выказалі свой недавер да працэсу датэрміновага галасавання і падліку галасоў.

Апрача таго, гаворыцца ў справаздачы, місія дагэтуль не атрымала запэўніванняў Цэнтрвыбаркама ў тым, што будзе забяспечаны паўнацэнны доступ назіральнікаў да падліку галасоў. "Па ўсім відаць, кожная ўчастковая выбарчая камісія будзе самастойна вырашаць, у якіх межах назіральнікам будзе дазволена весці паўнацэннае назіранне за падлікам галасоў", — гаворыцца ў дакуменце.

Пры гэтым назіральнікі зазначаюць, што ў большасці выпадкаў участковыя выбарчыя камісіі складаюцца з прадстаўнікоў адной і той жа арганізацыі або ўстановы, дырэктар якой адначасова прызначаны і старшынёй камісіі. "Гэта можа стварыць паміж членамі камісіі адносіны іерархічнай падпарадкаванасці", — падкрэсліваецца ў дакладзе.

Папярэднія вынікі маніторынгу СМІ, лічаць назіральнікі, сведчаць аб тым, што асвятленне выбараў у СМІ як на агульнанацыянальным, так і на мясцовым узроўні сканцэнтравана ў асноўным на працэсуальных аспектах выбарчага працэсу. "Большасць СМІ, пераважна дзяржаўнай формы ўласнасці, надалі пільную ўвагу прэзідэнту, а таксама дзяржаўным органам, у тым ліку ўраду і ЦВК, а не ролі парламента ці кандыдатаў", — гаворыцца ў дакладзе.

НОВАЕ ІМЯ

Арцём ШАРКОЎ:

«Міністэрствы і ведамствы паразітуюць на працоўным насельніцтве краіны»

Арцёму Шаркову ўсяго 23 гады. Ён быў адзін з самых маладых, хто спрабаваў стаць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. "Народная воля" паспрабавала высветліць у Арцёма, навошта маладыя людзі ідуць у палітыку.

— Вам 23 гады, але вы сцвярджаеце, што займаецеся палітыкай ужо 4 гады... Гэта значыць, калі маладыя людзі хадзілі на вечарынкі, сустракаліся з дзяўчатамі, вы бавілі час у кампаніі сур'ёзных дзядзькаў і разумных кніг?

— Можна ж хадзіць на дыскатэкі, сустракацца з сябрамі і перад гэтым або пасля гэтага ў кампаніі сур'ёзных мужчын абмяркоўваць разумныя кніжкі *(смяецца)*. Гэта нават карысна — сваё разуменне нейкіх сітуацый можна распаўсюджваць сярод знаёмых і сяброў. Праўда, знаёмыя ставяцца да мяне насцярожана. Шмат хто баіцца мяне, не ведае, аб чым са мной размаўляць.

— Вы працуеце спецыялістам па сувязях з грамадскасцю ў кампаніі "Скайстар інтэрпрайз"...

— Да таго ж я яшчэ вучуся ў Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва па спецыяльнасці юрыст-палітолаг. Улетку скончыў Усходнееўрапейскую школу палітычных даследаванняў пры Савеце Еўропы. Да "Скайстар інтэрпрайз" быў памагатым кіраўніка Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, а таксама Рэспубліканскай федэрацыі прадпрымальнікаў. Працаваць я пачаў у школе — на будоўлі кур'ерам. Паступова спрабаваў расці і чагосьці дамагацца ў жыцці.

— Вы апісваеце жыццё большай часткі беларусаў так: раніцай яны ідуць на працу, увечар прыходзяць дахаты, глядзяць беларускае тэлебачанне пад кілішачак чаго-небудзь, выхадныя і нават водпуск праводзяць на дачы... Вы выраслі ў іншай сям'і?

— У іншай. Хоць дачу мы таксама маем, але яна выкарыстоўваецца як месца для адпачынку, а не катаржнай працы. Я бы не аднёс сваю сям'ю да класа інтэлігенцыі. Мае бацькі — простыя працаўнікі, якія ўсё жыццё працуюць на кагосьці. Хоць маці калісьці мела свой бізнес.

— Ці падтрымліваюць сваякі і блізкія ваша імкненне да палітычнай кар'еры?

— Падтрымліваюць. Хоць і вельмі асцерагаюцца за мяне — баяцца, што могуць націснуць, зламаць.

— А самі вы гэтага не баіцеся?

— Пакуль мне яшчэ рана гэтага баяцца — у мяне няма ні сям'і, ні дзяцей. Калі з'явяцца — буду больш асцярожным... Трэба быць моцным і да ўсяго гатовым — палкі ў колы ставяць. Аднак я атрымаў адмову ў рэгістрацыі, якую спрабаваў абскардзіць...

— Не ўзнікае жадання пажыць спакайней?

— Мне гэта нецікава. Мне не падабаецца сядзець на канапе або ляжаць дзесьці на пляжы, не падабаецца жыць спакойным, па звыклай завядзёнцы, жыццём. Мне цікава ісці наперад, чагосьці дамагацца — не толькі для сябе, але і для іншых людзей.

— Чаго збіраліся дамагчыся ў Палаце прадстаўнікоў?

— Рэфармавання дзяржаўнага кіравання. У сферы заканадаўства і рэгуляванні гаспадарчых адносін у нашай краіне — поўнае бязладдзе. Наша дзяржава спарадзіла вялізную колькасць бюракратычных структур — міністэрстваў і ведамстваў, якія вялікую частку свайго працоўнага часу займаюцца перапіскай адзін з адным. На мой погляд, міністэрствы і ведамствы паразітуюць на працоўным насельніцтве краіны. Мне гэтая сітуацыя вельмі не падабаецца. Я бы жадаў яе змяніць у бок памяншэння колькасці міністэрстваў і ведамстваў: з 38 да 7—10, як у Швейцарыі.

Вольга ПРУДНІКАВА.

У Віцебску працуе перадвыбарны таталізатар

Згуляць з выбаршчыкамі ў таталізатар вырашыла гарадская газета "Віцьбічы". Да 26 верасня яна прапанавала чытачам даслаць у рэдакцыю спіс кандыдатаў, якія стануць дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў па кожнай выбарчай акрузе вобласці.

Той, хто першы правільна пералічыць прозвішчы ўсіх пераможцаў, атрымае прыз. На жаль, прыз толькі адзін, таму жадаючыя атрымаць яго мусяць паспяшацца.

Заклік адчаю

Пасля наведвання Генеральнай пракуратуры каля 40 грамадзян з розных рэгіёнаў краіны аб'явілі аб байкоце парламенцкіх выбараў і заклікалі далучыцца да акцыі ўсіх, хто пацярпеў ад самавольства чыноўнікаў. Гэтыя грамадзяне прынялі адпаведную адозву.

У інтэрв'ю БелаПАН адзін з падпісантаў адозвы, тэхнічны дырэктар ТАА "Віторжжа" Уладзімір Журба з Наваполацка (Віцебская вобласць), расказаў, што ў выніку крымінальнай справы, заведзенай на жонку, яна знаходзіцца пад следствам, яго прадпрыемства разарылася. Прадпрымальнік прыехаў у сталіцу на прыём да генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча. "Аднак у дзень прыёму генпракурор нават не выйшаў да людзей. А сярод нас былі і жанчыны састарэлага ўзросту, якія прыехалі здалёк у надзеі вырашыць свае праблемы. І гэта наглядны прыклад стаўлення цяперашняй улады да народа", — сказаў У.Журба.

Паводле слоў дачкі рэпрэсаванага і ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны мінчанкі Соф'і Шастаковіч, на працягу многіх гадоў яна не можа выпісаць са сваёй кватэры былога зяця, які там даўно не жыве. "Я пайшла на байкот выбараў таму, што шосты год не магу дабіцца справядлівасці, мае канстытуцыйныя правы парушаюцца, чыноўнікі падпісваюць дакументы не чытаючы, за што не нясуць ніякай адказнасці", — зазначыла С.Шастаковіч.

У адозве, у прыватнасці, гаворыцца, што "выбары ў Беларусі страцілі ўсялякі сэнс". "Згодна з законамі, прынятымі дэпутатамі парламента, павінна жыць краіна. Аднак мы на ўласным вопыце пераканаліся, што беларускія чыноўнікі пастаянна парушаюць законы. Вось чаму ў нас пануе беззаконнасць. Прыняцце новых законаў у такой абстаноўцы будзе толькі садзейнічаць беззаконнасці і пакрываць яе", — лічаць аўтары дакумента.

Яны заклікаюць грамадзян пераадолець страх, падумаць аб сваіх дзецях і ўнуках, будучыня якіх "залежыць не толькі ад кавалка хлеба на стале і даху над галавой". "Для годнага жыцця трэба куды больш, і ў першую чаргу — ўлада, якая служыць народу", — гаворыцца ў звароце.

Зварот адрасаваны прэзідэнту, старшыні Цэнтрвыбаркама, кіраўніку офіса АБСЕ ў Мінску і прадстаўніку ААН у Беларусі.

Марат ГАРАВЫ.

Мыш не прапаўзе без дазволу спецслужбаў

У інтэрнеце з'явіўся дакумент пад назвай "Рашэнне на забеспячэнне аховы правапарадку і дарожнай бяспекі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення на тэрыторыі Брэсцкай вобласці выбараў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання".

Дакумент зацверджаны начальнікам УУС Брэсцкага аблвыканкама і ўзгоднены з начальнікам УКДБ па Брэсцкай вобласці і пракурорам Брэсцкай вобласці. З гэтага дакумента, датаванага 7 жніўня 2008 года, стала вядома аб стварэнні на тэрыторыі Брэсцкай вобласці Сітуатыўна-аператыўнага штаба (САШ) УУС *"у мэтах каардынацыі дзеянняў сіл і сродкаў, задзейнічаных на ахову правапарадку ў перыяд правядзення выбарчай кампаніі 2008 года"*. У штаб увайшлі прадстаўнікі розных структурных падраздзяленняў абласнога УУС.

Паводле дадзенага дакумента, розным структурным падраздзяленням і іх кіраўнікам ставіцца задача на правядзенне наступных мерапрыемстваў: прыняцце прывентыўных мер па папярэджанні магчымых правакацыйных дзеянняў, нейтралізацыі грамадзян, якія выношваюць замыслы сарваць, дэзарганізаваць падрыхтоўку і правядзенне выбараў ці ажыццявіць акцыі па дэстабілізацыі абстаноўкі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, у тым ліку з боку нефармальных маладзёжных груповак; арганізацыя працы са спецапаратам, арыентаваўшы яго на выяўленне асоб, схільных да здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў у перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, у тым ліку правядзення несанкцыянаваных мерапрыемстваў; своечасовае інфармаванне САШ УУС аб перасоўванні дэструктыўна настроеных грамадзян чыгуначным транспартам; правядзенне працоўных сустрэч са старшынямі судоў па пытаннях скарачэння колькасці прымянення да асоб, якія здзейснілі правапарушэнні, спагнанняў у выглядзе адміністрацыйных арыштаў на час правядзення выбараў; прафілактычныя размовы з паштальёнамі аддзяленняў сувязі, старастамі сельскіх саветаў аб недапушчальнасці правядзення з іх боку незаконнай агітацыі і распаўсюджванне друкаваных матэрыялаў антыдзяржаўнага зместу, своечасовага інфармавання праваахоўных органаў пры выяўленні грамадзян, якія займаюцца антыдзяржаўнай агітацыяй і заклікаюць да байкоту выбараў; арганізаваць узаемадзеянне з УКДБ Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці і тэрытарыяльнымі аддзеламі на перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў — па пытаннях кантролю за перамяшчэннем і знаходжаннем замежных грамадзян, аператыўнага кантролю за лідэрамі дэструктыўных сіл, асобамі, які задумваюць тэрарыстычныя акты; забяспечыць своечасовае адсочванне і прадастаўленне па факсе ў САШ УУС негатыўнай інфармацыі, надрукаванай у сродках масавай інфармацыі, якая датычыцца падрыхтоўкі і правядзення выбараў...

"Аб існаванні такіх дакументаў мы ведалі яшчэ з 1999 года, з моманту правядзення альтэрнатыўных выбараў, — распавядае праваабаронца **Гары ПАГАНЯЙЛА**. — *Наколькі вядома, тады па ўзгадненні з Камітэтам дзяржбяспекі і Саветам бяспекі былі распрацаваны экстраардынарныя меры па спыненні экстрэмізму. У мерапрыемствах, якія праводзіліся, праходзіў і палітычны пераслед апазіцыйных партый і ўкараненне ў апазіцыйныя рухі адпаведных супрацоўнікаў спецслужбаў, так званых "сексотаў". Гэта не проста прафілактыка, а прыняцце прафілактычных і экстранных мер супраць лідэраў апазіцыі. Прадугледжвалася супрацьдзеянне перамяшчэнню па Беларусі дыпламатычнага корпуса, праслухоўванне тэлефонных размоў і іншыя антыканстытуцыйныя мерапрыемствы, якія праводзіліся з мэтай блакіравання намаганняў, якія прыкладваліся для правядзення альтэрнатыўных выбараў. Як мы памятаем, тады кандыдатамі ў прэзідэнты былі Зянон Пазьняк і Міхаіл Чыгір. Першы на той час з'ехаў за мяжу, а Міхаіла Чыгіра 30 сакавіка арыштавалі. Віктар Ганчар у якасці старшыні Цэнтрвыбаркама разгарнуў па краіне сетку выбарчых адміністрацый, і выбарчая кампанія набірала ход. Ведаю, што на 19 верасня 1999 года было прызначана сумеснае пасяджэнне дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га і 13-га скліканняў, лідэраў апазіцыйных партый, грамадскіх аб'яднанняў і дэмакратычных структур для таго, каб прыняць рашэнне аб нелегітымнасці ўлады і ўсіх тых дзяржаўных структур, якія падтрымлівалі дзеючы рэжым. Напярэдадні менавіта гэтага сходу, у ноч на 17-га верасня, Віктар Ганчар знік. Натуральна, што ў адсутнасць лідэра, які рыхтаваў усе дакументы, сход не адбыўся... Што датычыцца вышэйназванага дакумента, які зараз патрапіў у рукі апазіцыі, дык ён таксама вельмі нагадвае ранейшыя аналагічныя планы сілавых структур не толькі па дыскрэдытацыі апазіцыі, але і па прэвентыўных мерах, прыёмах, якія могуць выкарыстоўвацца. І меры, на якія праваабаронцы звярнулі ўвагу, выходзяць за межы паўнамоцтваў праваахоўных органаў і Канстытуцыі".*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

Працавалі са стратамі

У студзені—ліпені 2008 года 276 прамысловых прадпрыемстваў Беларусі (13% ад агульнай колькасці) працавалі са стратамі, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу.

За аналагічны леташні перыяд доля стратных прадпрыемстваў складала 19,6%. Сума чыстых страт такіх прадпрыемстваў за сем месяцаў гэтага года склала 160,9 млрд рублёў. Найбольшыя сумы страт адзначаны ў прадпрыемстваў харчовай прамысловасці (57 млрд рублёў), машынабудавання і металаапрацоўкі (45,5 млрд рублёў), лёгкай прамысловасці (37,4 млрд рублёў), а тасама лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці (14,1 млрд рублёў).

Максімальная доля стратных прадпрыемстваў прыпала на сістэму Аблсельгасхарча — 28,8% (64 прадпрыемствы) і канцэрна "Беллегпрам" — 28% (26 прадпрыемстваў). Менш за ўсё стратных прадпрыемстваў у сістэме Мінсельгасхарча (арганізацыі рэспубліканскай формы ўласнасці) — 2,7% (тры прадпрыемствы). Без страт працавалі ўсе прадпрыемствы канцэрна "Белнафтахім".

Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг прамысловых прадпрыемстваў за студзень—ліпень склала 18,6% (за студзень—ліпень 2007 года — 13,1%), рэнтабельнасць продажу — 13% (9,5%).

Вышэйшая, чым у сярэднім па прамысловасці, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ, паслуг за студзень—ліпень гэтага года была ў хімічнай прамысловасці (73,8%), нафтаздабываючай прамысловасці (64,3%), медыцынскай прамысловасці (21%), прыборабудаванні (20,4%), прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

Ніжэйшы, чым у сярэднім па прамысловасці, узровень рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі, работ, паслуг склаўся ў станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці (13,5%), швейнай (10,7%), нафтахімічнай (9,6%), тэкстыльнай (8,3%), цэлюлозна-папяровай (7,1%), нафтаперапрацоўчай (6,3%), мукамольна-крупяной і камбікормавай (5,2%), мясной і малочнай (5,1%), мікрабіялагічнай прамысловасці (3,5%).

Марына НОСАВА, БелаПАН.

Столичная приватизация

Согласно решению горисполкома, в 2008—2010 годах в столице планируется продать или преобразовать в открытые акционерные общества 16 объектов.

В 2008 году — имущественный комплекс производственно-торгового КУП "Чайка" на улице Пожарского, 27, КПУП "Эксмолтех" (пр.Партизанский, 172), торгово-закупочное КУП "Золотая осень" (ул.В.Хоружей,15).

Среди объектов приватизации в 2009 году — торговое КУП "Торгстройматериалы", КУП по химчистке одежды и стирке белья "Минутка", три объекта КУП бытового обслуживания населения и эксплуатации зданий "Бытэкс". В 2010-м — КУП "Грузавтотранссервис", торгово-производственное КУП "Ласунак", КУП "Минский парниково-тепличный комбинат" и культурно-спортивное КУП "Городской центр "Минский ледовый дворец спорта".

Кроме того, Мингорисполком утвердил трехлетний план продажи акций ОАО, созданных в процессе приватизации госсобственности, находящихся в коммунальной собственности Минска. Среди них — акции ресторана "Беларусь", универсамов "Рига" и "Фрунзенский", ОАО "Ремжилстрой" и др. Акции планируется продавать с аукционов и конкурсов.

БелаПАН.

Перакрыў ліміт — плаці двайны тарыф

За электраэнергію, спажытую звыш устаноўленых гранічных лімітаў, беларускія прадпрыемствы з лістапада 2008 года будуць плаціць па двайных тарыфах. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў №1339.

Дакументам, у прыватнасці, вызначаны парадак вызначэння гранічных узроўняў спажывання электраэнергіі, што адпускаецца арганізацыямі ДВА "Белэнерга" для прадпрыемстваў з далучанай электрычнай магутнасцю 750 кілавольт-ампер (кВА) і больш, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржкіравання, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму.

Ліміты на электраэнергію ўводзяцца для арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі (уключаючы арганізацыі, маёмасць якіх знаходзіцца ў камунальнай уласнасці) з гадавым аб'ёмам спажывання электрычнай энергіі 1 млн. кВт/гадз. і больш.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 1 кастрычніка 2008 года павінна прадставіць у Мінэнерга пералік арганізацый з гадавым аб'ёмам спажывання электрычнай энергіі 1 млн кВт/гадз. і больш. У сваю чаргу Міністэрству энергетыкі даручана да 1 лістапада прывесці дагаворы на забеспячэнне электрычнай энергіяй "у адпаведнасць са згаданай пастановай і прыняць іншыя меры па яе рэалізацыі".

Разлічвацца гранічныя ўзроўні спажывання электрычнай энергіі для прадпрыемства будуць па спецыяльнай формуле, зыходзячы з велічыні спажывання электрычнай энергіі ў папярэднім годзе (у аналагічным месяцы папярэдняга года) з улікам планаемага росту аб'ёму прадукцыі прамысловасці (работ, паслуг прамысловага характару). Для арганізацый ЖКГ з гадавым аб'ёмам выкарыстання электрычнай энергіі 1 млн кВт/гадз. і больш ліміты разлічваюцца з улікам неабходнасці зніжэння спажывання электраэнергіі да фактычнага спажывання ў аналагічным месяцы папярэдняга года, пры гэтым прымяняецца паніжальны каэфіцыент 0,97.

Наталля КАРОТКАЯ.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Кто за ценой не постоит?

Таких цен белорусы уже и не помнят...

Намедни один весьма "продвинутый" журналист на страницах "самой главной газеты страны" повел речь о росте цен и выступил в качестве апологета госорганов Беларуси, занимающихся ценовым регулированием: мол, что тут поделаешь, инфляция растет во всем мире, а на глобальные процессы, в частности, на подорожание нефти и газа, мы повлиять не в силах. Далее сей "работник пера", пламенно воззвав соотечественников к тотальной экономии и бережливости, привел жизненный пример своей родственницы из германского города Кобленец, вышедшей замуж за немца. Она, дескать, решила однажды похвалиться своим кулинарным искусством. Муж все с аппетитом съел, но потом на компьютере быстро подсчитал, сколько средств ушло на готовку, и сказал: "Это очень вкусно, но дорого". И добавил: "От такой пищи полнеют", — а ему, мол, самому некуда тратить жиры и углеводы — работа у него малоподвижная...

Такой вот вроде забавно-поучительный пример. Как в анекдоте:

— Святой отец, вы отпустите мне грехи?

— А стоит ли, дочь моя? Грехи — они как цены, их только отпусти!..

Теперь давайте разберемся по-серьезному. Итак, **первое**. Лично я желал бы просто взглянуть в глаза сего экономного, журящего "лишние калории" немца, если бы он трудился, к примеру, в литейном или сварочном цехе на нашем белорусском предприятии, где оные калории улетучиваются из организма чуть ли не мгновенно! "Па малаку ног не павалаку", — говорят в Беларуси, на огурцах и бульбе, так сказать, долго не протянешь — рабочему человеку необходимо что-то посолиднее, дабы в итоге не положить зубы на полку. Между тем, по официальным данным Министерства статистики и анализа, индекс потребительских цен за январь — август текущего года по сравнению с аналогичным периодом 2007-го у нас составил 114,8%, а платные услуги населению возросли почти на 18 процентов, в том числе коммуналка — на целых 30! Мясо за этот срок подорожало на 15,2%, а с декабря минувшего года — на семь; молоко и молочные продукты соответственно — на 29,6 и 7,9%. Индекс потребительских цен на ряд других продуктов приведен в **таблице 1**.

Таблица 1.

	Январь—август 2008 г. к январю—августу 2007 г.	Август 2008 г. к декабрю 2007 г.
Масло животное	131,4	112,8
Масло растительное	184,7	115,0
Сыр твердый	125,4	107,1
Яйцо	112,9	104,4
Хлеб и хлебобулочные изделия	112,2	110,9
Мука пшеничная	119,3	118,4
Макаронные изделия	124,2	120,2
Крупа и бобовые	123,9	123,0

Кроме того, оплата населением электроэнергии подросла с декабря 2007-го на 29,4%; газоснабжения — на 90,9%, водоснабжения — на 16,4%; абонементная плата за пользование квартирным телефоном — на 10,1 процента и т.д. и т.п. Такие вот реалии нашего бытия.

Второе (по поводу тезиса о росте цен во всем мире). По данным профессора Станислава Богданкевича, в первом полугодии цены в США и Европе повысились максимум на 3-6 процентов (в США — 4,9%, Великобритании — 3,8%, Германии — 3,3%, Японии — 2%). Если же проанализировать увеличение стоимости определенных групп товаров, картина такова: с начала года увеличение цен на хлеб, мясо и молочные продукты составило соответственно в Чехии — 2,9, 3,0 и минус 3 процента. В Польше — 4,7, 3,8 и 0,3%. В Германии — 3,6, 1,6 и минус 0,3 процента. Лишь в Литве, Латвии и России цены на некоторые продовольственные товары поднимались быстрее, чем у нас. Однако здесь следует учитывать тот факт, что в Беларуси средняя зарплата составляет всего около 430 долларов в эквиваленте. В России же — более 760 "зеленых", в Литве — около тысячи, Польше — 1200 "баксов", а, например, средняя пенсия в нашей республике ниже минимальной пенсии в Латвии, Эстонии или Словакии. Как говорится, почувствуйте разницу! Более того, по утверждению известного белорусского экономиста Ярослава Романчука, килограмм говядины в Аргентине стоит 1,5 доллара, а в Беларуси — более семи; килограмм свинины в Бразилии стоит тоже полтора доллара, а мы платим почти восемь. Цена же на мясо птицы у нас в 3,5 раза выше, чем на мировом рынке. Вследствие такой ценовой политики, считает Ярослав Романчук, каждая городская белорусская семья переплачивает за продукты питания до 300 долларов ежегодно...

Наконец, **третье**. Россия пока продает нам газ по относительно низкой цене, тем самым на десятки миллиардов долларов косвенно субсидируя Беларусь. Однако даже при этих, казалось бы, благоприятных условиях дефицит внешнеторгового баланса у нас составляет порядка 3 млрд долларов, а инфляция достигла 16 процентов. С 2011 года восточный сосед намерен требовать от Беларуси оплачивать газ и нефть по мировым ценам. Что тогда станет с нашей экономикой, наверное, одному Богу известно. Кстати, о нефти. С точки зрения руководителя аналитического центра "Стратегия" Леонида Заико, Беларусь нынче выживает во многом благодаря работе "Нафтана" и "Полимира". В текущем году они настолько удачно продают нефтепродукты, что это окупает не только приобретение сырой нефти, но практически можно было бы сделать бесплатным внутриреспубликанское потребление бензина. К сожалению, его стоимость в нашей стране только растет.

P.S. *Возвращаясь к началу статьи и дебатируя с весьма "бережливым" журналистом, хотелось бы заметить: экономить, конечно, нужно, однако не на своем здоровье. В противном случае, следуя пагубной логике, можно договориться до того, что и жить тоже вредно.*

Игорь ГРИШАН.

ТЫМ ЧАСАМ

Цэны растуць і ў сталіцы

Цэны на харчовыя тавары ў Мінску ў студзені -- жніўні 2008 года выраслі на 19,3% у параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам, паведамляе Мінскае гарадское ўпраўленне статыстыкі.

За восем месяцаў цэны на алей павялічыліся на 91,5%, макаронныя вырабы — на 35,1%, масла — на 33,5%, малако і малочныя прадукты — на 29,2%, крупу і бабовыя — на 26,3%, сыры цвёрдыя — на 21,4%, муку пшанічную — на 21,2%, мяса і птушку — на 19,2%, кандытарскія вырабы — на 16,3%, каўбасныя вырабы — на 15,3%, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 14%, яйкі — на 13,5%, алкагольныя напоі — на 13,1%. Меншы рост цэн адзначаны на мясныя кансервы (6,8%), рыбу і рыбапрадукты (6,7%), цукар (2,2%).

За студзень — жнівень гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года бульба падаражэла на 4,4%. Цэны на іншую гародніну выраслі на 26,6%, у тым ліку на буракі — на 65,8%, перац салодкі — на 39,1%, капусту свежую — на 37,4%, моркву — на 35,6%, таматы свежыя — на 24,9%, агуркі свежыя — на 15%, часнок — на 8%, цыбулю рэпчатую — на 4,3%. Фрукты падаражэлі на 41,4%, у тым ліку цытрусавыя — на 68,7%, яблыкі — на 34,8%.

Цэны на платныя паслугі ў горадзе павялічыліся на 18,9%. Цэны на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўзраслі на 31%, санаторна-аздараўленчыя — на 28,8%, дашкольных устаноў — на 28,1%, турыстычныя — на 20%, бытавыя — на 18,5%, пасажырскага транспарту — на 13,5%, вышэйшай адукацыі — на 11,9%, фізічнай культуры і спорту — на 9,8%, арганізацый культуры — на 5,5%, сувязі — на 3,6%.

Марына НОСАВА, БелаПАН.

ПО ПОВОДУ

Жареный петух еще не клюнул?

Прошел год, за который в белорусской системе налогообложения ничего не изменилось. Всемирный банк и МФК опубликовали шестой по счету ежегодный отчет "Doing Business 2009", согласно которому Беларусь сохранила за собой "лидерство" — 1-е место в мире из 181 страны по величине налоговой нагрузки (количество уплачиваемых налогов, сборов, платежей).

АФН.

Мытныя пошліны на імпартную гародніну

Такое рашэнне ўтрымліваецца ва ўказе кіраўніка дзяржавы №523 ад 18 верасня 2007 года, апублікаваным на Нацыянальным прававым інтэрнет-партале.

Мытныя пошліны на імпартуемую гародніну ўстаноўлены да 1 снежня 2008 года і з 1 сакавіка да 1 чэрвеня 2009 года. У прыватнасці, стаўкі сезонных мытных пошлін на таматы свежыя або ахаладжаныя і агуркі, што ўвозяцца ў Беларусь, складуць 50% мытнага кошту, на цыбулю рэпчатую — 180% , капусту белакачанную — 75%, моркву — 120%, буракі сталовыя — 150%.

Гэтае рашэнне прынята "для абароны інтарэсаў беларускіх таваравытворцаў", сцвярджаецца ў дакуменце.

Хто атрымае жыллё?

У Беларусі для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у 2008 годзе запланавана пабудаваць 2 млн 131 тыс. кв. м жылля ў шматкватэрных жылых дамах у гарадах, што складзе 76% агульнага аб'ёму збудавання такіх дамоў у краіне. Гэтая норма ўтрымліваецца ў сумеснай пастанове Савета міністраў і Нацыянальнага банка.

Дакумент удакладняе методыку падліку працэнта жылля, якое павінна будавацца для чаргавікоў. Апошнія два гады ў афіцыйных статыстычных звестках гэты паказчык вызначаўся зыходзячы з агульнага аб'ёму будаўніцтва жылля ў краіне. Разам з тым, згодна з падпісаным у 2006 годзе ўказам прэзідэнта №676, за аснову такіх падлікаў неабходна браць менавіта будаўніцтва шматкватэрнага жылля.

Доля жылля, пабудаванага для чаргавікоў у шматкватэрных гарадскіх дамах, у 2007 годзе склала 72%. Да 2010 года гэты паказчык запланавана давесці да 80%.

Усяго сёлета ў Беларусі павінна быць пабудавана 5,2 млн кв. м жылля. У тым ліку 1,584 млн кв. м — у сельскіх населеных пунктах, 2,821 млн кв. м — у шматкватэрных жылых дамах. На 1 студзеня 2008 года ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Беларусі знаходзілася 717,5 тыс. сем'яў.

Марына НОСАВА.

ВЗГЛЯД

Белорусскому бизнесу надо быть более активным

Отражаются ли кризисы на мировых финансовых рынках, подобные нынешнему, на экономике Беларуси? Свое мнение по этой и другим актуальным проблемам корреспонденту "Народной воли" высказал председатель Минского столичного союза предпринимателей и работодателей Владимир КАРЯГИН.

— Безусловно, отражаются, — считает Владимир Николаевич. — Потому что наша страна, пусть еще и слабо, но все-таки интегрирована в международную экономическую систему. И в плане экспортно-импортной, инвестиционной политики, функционирования банковского сектора, курса валют, стоимости акций предприятий и так далее. Наш предпринимательский союз внимательно отслеживает ситуацию на финансовых рынках, в первую очередь, российском. Для белорусского правительства весьма важно сейчас поддерживать отечественных промышленников и предпринимателей, не создавать нервозную обстановку. Ведь им сегодня очень непросто работать, отслеживать конъюнктуру рынка, правильно реагировать на то, что теперь происходит на различных рыночных площадках.

— Белорусское бизнес-сообщество удовлетворило принятое недавно Минэкономики решение об изменении "нашумевшего" постановления №179, касающегося торговых надбавок на импортные товары?

— Новое, 183-е, постановление Минэкономики устраивает нас не "на все сто". Потому что до сих пор не приняты меры по либерализации ценообразования для отечественных производителей. Для некоторых видов товаров установленного 30-процентного коридора торговой надбавки на импортируемые товары явно не хватает. Так, серьезно ущемлены белорусские торговцы мебелью, стройматериалами, многие компоненты которых поступают из-за рубежа, да и ряд других отечественных импортеров не вполне удовлетворен принятым решением. Белорусскому бизнесу нужно быть более активным. Надо объединяться на основе, к примеру, проведения совместных экспертиз, расчетов и требовать от правительства учета мнения предпринимателей, их аргументации. Как это было в случае с 179-м постановлением, когда мы сумели обоснованно доказать, что его реализация может нанести большой ущерб экономике Беларуси.

— Как, на ваш взгляд, должен нынче идти процесс приватизации госпредприятий?

— Конечно, хотелось бы больше гласности о ее ходе. В свою очередь столичный союз предпринимателей и работодателей намерен организовать ряд обучающих семинаров на тему приватизации. Ибо речь сейчас идет о внедрении новых форм корпоративного управления, ценообразования, стимулирования и оплаты труда, подготовке квалифицированного менеджерского состава. Когда это будет реализовано, тогда, я убежден, процесс приватизации даст позитивный результат...

Игорь ГРИШАН.

У ТЭМУ

А вось меркаванне старшыні Каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Мінска **Алеся МАКАЯ**.

— Канстытуцыя павінна быць вышэй за ўсе пастановы, указы, дэкрэты і гэтак далей. На жаль, большая частка грамадскай і эканамічнай дзейнасці ў нашай краіне, у тым ліку прадпрымальніцкая, рэгулюецца апошнімі. Яны часта носяць часовы характар і кожны раз нервуюць прадпрымальнікаў. Яскравы прыклад — 760 указ прэзідэнта мінулага года наконт перарэгістравання індывідуальных прадпрымальнікаў, калі працу страцілі, паводле маіх звестак, 15 тысяч чалавек. Калі так пойдзе далей, яе страцяць сотні тысяч.

У мінулым годзе мы звярталіся да дэпутатаў парламента, каб высветліць, ці адпавядае указ Канстытуцыі. Але народныя абраннікі праігнаравалі зварот. Вось чаму цяпер мы хочам справядлівых выбараў, хоць гэтага ў сённяшніх умовах цяжка чакаць. Тады супольнасць прадпрымальнікаў спрабавалі запалохаць арыштамі, адміністрацыйнымі пакараннямі. Але ж яны проста патрабавалі выканання Асноўнага Закону! Мы хацелі "дастукацца" да ўлады, каб яна не парушала яго. Бо менавіта з прычыны такіх парушэнняў часта ўзнікае нестабільнасць у нашым грамадстве.

Колькі будзе банкрутаў?

Колькасць спраў аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) арганізацый прыватнай формы ўласнасці на 1 верасня 2008 года склала 1437, або 93,7% агульнай колькасці спраў гэтай катэгорыі, што знаходзяцца ў вытворчасці, паведамілі БелаПАН у прэс-службе Вышэйшага Гаспадарчага суда.

Агульная колькасць спраў, што знаходзіліся ў вытворчасці гаспадарчых судоў на 1 верасня, склала 1533. А каля 38% (582) спраў аб банкруцтве знаходзіцца ў вытворчасці Гаспадарчага суда Мінска.

Апрача таго, у вытворчасці Гаспадарчых судоў знаходзілася 96 спраў аб эканамічнай неплацежаздольнасці арганізацый, якія маюць значэнне для эканомікі і сацыяльнай сферы. Да іх адносяцца дзяржаўныя арганізацыі; арганізацыі, якія маюць долю дзяржаўнай уласнасці ў статутным фондзе, горадаўтваральныя і прыраўнаваныя да іх арганізацыі, бюджэтаўтваральныя, сістэмаўтваральныя арганізацыі.

У ВГС зазначылі, што 2/3 агульнай колькасці спраў складаюць справы, па якіх прынята рашэнне аб банкруцтве арганізацый з ліквідацыяй, 1/3 -- справы, па якіх вынесена рашэнне аб эканамічнай неплацежаздольнасці з санацыяй.

У жніўні Гаспадарчым судом Мінска распачата вытворчасць па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці ў адносінах да адкрытага акцыянернага таварыства "Дражджавы камбінат" і прадстаўлена інфармацыя аб распачынанні вытворчасці па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці гандлёвага камунальнага унітарнага прадпрыемства "Гарзабеспячэннеінвест". У Гаспадарчым судзе Брэсцкай вобласці распачата вытворчасць па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці ў адносінах да унітарнага прадпрыемства "Ганцавічырэсурсы" УП "Брэстаблрэсурсы".

Марына НОСАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

КАЛІ Б Я БЫЎ ПРЭЗІДЭНТАМ...

Турнуў бы кожнага трэцяга чыноўніка

Я жыву ў невялікім горадзе. Але гэта не значыць, што ў нас мала чыноўнікаў. Калі параўнаць з ужо далёкімі савецкімі часамі, то іх, па маіх падліках, стала больш як мінімум у два разы. Дарэмна Аляксандр Лукашэнка некалі абяцаў скараціць штаты розных начальнікаў. Як мне здаецца, ён нават ім паспрыяў. Да яго мясцовыя чыноўнікі не мелі такіх шыкоўных кабінетаў з прыёмнымі, сакратаркамі. Гэта было дазволена першаму сакратару гаркама ці райкама партыі, старшыні выканкама ды яшчэ пяці-шасці асобам. А сёння любы дробны вертыкальшчык імкнецца мець еўрапейскага ўзроўню апартаменты, пры гэтым з шматлікай прыслугай.

На якіх машынах ездзілі раней мясцовыя начальнікі і начальнічкі? Некалькі чалавек — на "Волгах", астатнія — на "козліках" і "Масквічах". У апошнія гады амаль усе пераселі на іншамаркі, якія каштуюць не адзін дзесятак тысяч долараў. Ды і тэхнічнае абслугоўванне абыходзіцца ў кругленькую суму. Але што іх пасажырам да гэтага? Не са сваёй кішэні аплачваюцца бензін, рамонт, запчасткі, тэхабслугоўванне, усё — за народныя грошыкі.

Падзяжурце ля рынкаў, цэнтральных крам, школ, паліклінік — службовыя машыны цугам пад'язджаюць і ад'язджаюць. У іх не толькі самі начальнікі, але часцей за ўсё — іх жонкі, бацькі, дзеці.

Памятаецца, як некалі праводзіліся рэйды па выяўленні тых чыноўнікаў, якія, злоўжываючы службовым становішчам, выкарыстоўвалі замацаваны за імі транспарт у асабістых мэтах. Чаму б не вярнуцца да той практыкі і не прыжучыць начальнікаў, якія даўно пераблыталі дзяржаўную казну з уласнай кішэняй? Пра сумленне ім і нагадваць няма сэнсу, яны пляваць хацелі на думку грамадскасці.

І ўсё ж Аляксандр Лукашэнка павінен вярнуцца да сваіх абяцанняў. Можаце ўявіць, наколькі ўзмацнеў бы бюджэт дзяржавы, калі б ён турнуў, скажам, кожнага трэцяга чыноўніка. Вызваліліся б велізарныя плошчы памяшканняў, цэлы легіён сакратароў, памочнікаў, вадзіцеляў і іншых, прабачце за грубае слова, халуёў. Зусім іншай стала б атмасфера ў грамадстве. Сёння глядзяць людзі на бязмежка мясцовых князькоў і выказваюць незадавальненне ўсёй уладай.

Сцяпан АЎТУХОВІЧ,
пенсіянер.

Гродзенская вобласць.

І В ШУТКУ, И ВСЕРЬЕРЗ

За основу взять пенсию Станислава Шушкевича...

Спешу предложить вариант начисления пенсии уходящим депутатам Палаты представителей.

За основу нужно взять пенсию Станислава Шушкевича — 3 тысячи 200 рублей. Умножить на 100 процентов, так как при Лукашенко молчание депутатов считается золотом. Получится основная пенсия 320 тысяч рублей.

К ней можно делать надбавки за создание во время сессий видимости активности, за умение втирать очки избирателям. И еще тем, кто надоумил Лукашенко дать льготы на проезд дачникам в летний период. Благодаря чему не добавилось брошенных участков.

Люся ВОРОН.

г.Минск.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Ничему не научишь детей за полтора часа в неделю...

Без малейших сомнений подписываюсь под статьей "В аттестате — шестерки, семерки...".

Показуха в школе, произвол по отношению к учителям и ученикам прослеживаются еще со времен СССР. Помните пресловутые поездки "на картошку" и очистку полей от камней? Месяц учебного года пропадал в школах и вузах! Какие только обязанности не возлагали на учителей! Избирательные комиссии, дежурства в микрорайоне, перепись поголовья свиней, выколачивание взносов в ДОСААФ, Красный Крест, обеспечение подписки на неходовые и отраслевые газеты, журналы и так далее и тому подобное. Но тогда не было конкретной системы, поэтому отсутствовал гнетущий страх остаться без работы.

Теперь же этот страх довлеет над учителями, заставляя выполнять дурацкие идеи и задумки чиновников, как, например, привлекать учителей к обходу квартир, где живут злостные должники — неплательщики за жилищно-коммунальные услуги. И особенно возмутительно постоянное привлечение учителей и школьников к участию в массовках: открывает ли высокий чиновник очередной памятник, состоится ли хоккейно-футбольно-лыжное соревнование — загоняют на площадку или стадион школьников и их учителей выражать поддержку или энтузиазм. Это бесчеловечно!

Скажите, а когда педагогам заниматься своим непосредственным делом? Не поэтому ли сокращаются часы изучения конкретных предметов? Как учитель с большим стажем я возмущена новациями последней реформы, которые касаются сокращения времени на изучение иностранных языков, ликвидации школ с углубленными программами. Этим чиновники бросают поколение next в такую яму отверженности, изоляции в центре Европы, которую трудно будет ликвидировать в ближайшее десятилетие.

Все это меня возмущает, но, конечно, не удивляет. Посмотрите на наше руководство по ТВ! Это сплошные речевые инвалиды! Для них белорусский язык как иностранный. Русский язык они коверкают через слово... Если человек с историческим образованием публично утверждает, что Скорина жил и работал в Питере... то зачем же нашим властям шибко грамотные, владеющие языками молодые люди? Еще побегут искать хорошую работу за границей! Вдруг захотят читать альтернативную прессу или слушать радио!

В 1980-е годы мне пришлось участвовать в юношеской спартакиаде в Чехии. Стыдно было за ребят из СССР! Они не могли общаться ни с кем, каждому нужен был переводчик, группы из Швеции, ГДР, Польши, Финляндии свободно объяснялись на русском, чаще на английском.

Вот они — два урока в неделю! Это то, что наши дети и внуки будут иметь с третьего класса. И ведь каждый коллега господина Радькова, имеющий педагогическое образование, знает, что эффектнее всего языки усваиваются в раннем детстве, даже два-три языка одновременно.

Два урока в неделю — это пустая трата времени, ничему не научишь детей за 1 час 30 минут в неделю!

Незабвенному Ильичу в годы СССР приписывали фразу "Иностранные языки — это оружие в жизненной борьбе". И где бы я ни работала, с удовольствием этот лозунг вывешивала в кабинете иностранного языка. Ибо жизненный опыт много раз подтверждал правоту этого изречения, особенно в период "перестройки" распада Союза, возникновения многочисленных конфликтов на территории бывшего СССР.

Убедительно прошу всех родителей школьников при малейшей возможности помогать детям овладевать языками. И не обязательно это должны быть немецкий, английский, французский. Рядом с нами живут поляки, литовцы, латыши — учите их языки.

Мало денег — находите возможность обмениваться уроками разговорной речи с соседями.

Я убедилась, что люди, которые жили в СССР, особенно русские, очень пассивны, если не сказать ленивы, к изучению языков. Жить с 40-х годов в Эстонии, Литве, Латвии, в Средней Азии, Грузии, Армении... и не выучить язык местного населения — это позор и стыд. Это является одной из причин отчуждения, неприятия русских повсеместно в постсоветское время.

Галина Вадимовна ИВАНЧИК,
учитель английского языка (на пенсии).

ДЫСКУСІЯ

Для службістаў пенсіённы ўзрост можна і падняць

Хачу працягнуць дыскусію наконт пенсіённых праблем. На мой погляд, у дзяржавы ёсць магчымасць вырашыць некаторыя пытанні без асаблівых цяжкасцяў. Не трэба пужаць усіх сталых грамадзян, што з выхадам на пенсію ім давядзецца пачакаць. Для таго, каб знайсці дадатковыя сродкі ў дзяржавы, ёсць шмат іншых рэзерваў.

Мая прапанова — не трэба спяшацца падымаць пенсіённы ўзрост для ўсіх катэгорый грамадзян. У бліжэйшыя гады дастаткова гэта зрабіць толькі для ваеннаслужачых, супрацоўнікаў міліцыі, розных спецслужб. Давайце адкрыта скажам: сёння нашым вайскоўцам не трэба служыць на Камчатцы ці Чукотцы, у Сярэдняй Азіі ці на Паўночным полюсе. Па тэрыторыі наша Беларусь — маленькая краіна, служаць ваенныя, можна сказаць, дома. І пра асаблівыя цяжкасці не трэба гаварыць. Афіцэр ідзе на працу не раней, чым даярка на ферму ці рабочы на першую змену. А вучэнні на палігонах, вядома ж, не кожны дзень. Многім з нас таксама даводзіцца адлучацца з дому на тыдзень-другі, напрыклад, шафёры-дальнабойшчыкі да месяца знаходзяцца ў паездках. Але ж у 40—45 гадоў яны на пенсію не выходзяць. А пагоннікі такое права маюць.

Паглядзіце, колькі ў нас сёння ваенных, якія, як кажуць, і пораху не нюхалі. Хто ўсе гады праслужыў у тылавых падраздзяленнях, хто ў штабах, не зведаўшы ніякіх нязгод. Тое ж самае можна сказаць і пра многіх міліцэйскіх работнікаў, спецслужбістаў. У 40—45 гадоў яны поўныя сіл, не маюць ніякіх балячак. І іх на пенсію? Ды гэта, лічу, абсалютная бязглуздзіца.

У такія гады здаровы чалавек можа звар'яцець без работы. А таму літаральна ўсе ўчарашнія ваенныя, міліцыянеры, спецслужбісты ўладкоўваюцца на працу. Многія загадзя рыхтуюць для гэтага глебу. Карыстаючыся службовым становішчам, незаконна спісваюць тэхніку, а затым выкупляюць яе за капейкі і становяцца ўласнікамі. А стварыць затым фірму — не праблема. Вунь колькі былых вайскоўцаў сёння кіруюць рознымі прыватнымі прадпрыемствамі. І пенсію кладуць у кішэню і заробак маюць будзь здароў.

Не, дзяржава даўно павінна перагледзець парадак выхаду на пенсію ваеннаслужачых, супрацоўнікаў міліцыі, розных спецслужбаў. Слава Богу, мы ні з кім не ваюем і не збіраемся ваяваць, у нас спакойная абстаноўка ў гарадах і сёлах, і праца тых, хто выбраў для сябе пагоны, амаль нічым не адрозніваецца ад працы ўсіх астатніх. А таму, лічу, дзяржава не павінна ствараць для іх асаблівыя прывілеі.

Станіслаў КАЛЕСНІКОВІЧ,
пенсіянер.

НАБАЛЕЛАЕ!

Такіх ужо і гром не разбудзіць

Для мяне, падпісчыка "Народнай волі" з яе першага нумара, стала правілам — пасля прачытання перадаваць свежыя нумары газеты сябрам, знаёмым, аднадумцам, ахвотна чытаюць іх і журналісты мясцовых газет, пераважна людзі маладыя. Глядзіш — і чалавек 10—12 набіраецца тых, да каго даходзіць багатая праўдзівая інфармацыя аб сённяшнім жыцці краіны, яе набалелых праблемах, якія стараюцца абыходзіць многія дзяржаўныя газеты.

Нярэдка прапаную тым, хто ўжо добра знаёмы з "Народнай воляй", самім аформіць падпіску на яе. Часта сутыкаюся з шараговай абыякавасцю людзей, якім да лямпачкі ўсё тое, што дзеецца за межамі іх дома, кватэры ў "хрушчоўцы", каго задавальняюць і невысокія пенсіі, іржавы легкавік у двары, дачны ўчастак за горадам. Не болей.

Неяк з чарговым нумарам "Народнай волі" апусціў у паштовую скрынку сямейнай пары пенсіянераў-інтэлігентаў, даўно знаёмых мне, і выразку з апошняй старонкі пад назвай "Разбудзіце іх..." (з аддрукаваным на ёй квітком для пераводу грошай у бліжэйшым аддзяленні дзяржбанка). Праз тыдзень тэлефанаваў гаспадару кватэры, чалавеку не беднаму, і спытаў: можа вы, шаноўны, пералічылі грошы на газету, хоць на месяц. А ён мне адказвае: "Газет мы с женой вообще не выписываем, нас устраивает телевидение, так что я возвращаю вашу вырезку". І паклаў трубку. Між іншым, яму я падкідваў у паштовую скрынку "Народную волю" разоў шэсць, калі не болей. Не разбудзіў!

Як не ўспомніць мудрага пісьменніка Мікалая Гогаля, які ў свой час пісаў пра такіх людзей: "Хто ўжо кулак, таго не разагнеш у далонь". І гэта не вынік дрэннага выхавання ў дзяцінстве, нізкага ўзроўню адукацыі (у большасці тых, каго я ўгаворваў на падпіску, яна вышэйшая), а вынік вынішчэння ў грамадстве ўсяго нацыянальна беларускага, страты народам свайго ярка выражанага, як у літоўцаў, палякаў, нават ва ўкраінцаў, нацыянальнага аблічча.

У раённай бібліятэцы да паліц з беларускімі кніжкамі амаль ніхто з наведвальнікаў, пераважна людзей сярэдняга ўзросту і пенсіянераў, нават не падыходзіць! Бяруць абярэмкамі, па 6—8 кніжак дэтэктыўнага, любоўнага жанру, фантастыку. Вядома ж, на расійскай мове.

...Усё ж сёлета мне ўдалося заахвоціць на падпіску "Народнай волі" двух чалавек: мастака і дворніка, маладых людзей. Хочацца верыць, што яны будуць не апошнімі.

Алесь КАРНІЦКІ,
жыхар г.Слуцка.

УТОЧНЕНИЕ

Главному редактору газеты "Народная воля" И.П.Середичу

Уважаемый Иосиф Павлович!

Институт радиационной безопасности "Белрад" считает необходимым поставить Вас в известность о следующем.

Институт благодарен Вам за публикацию в газете "Народная воля" за 29 августа 2008 года (№№129--130) материалов, посвященных памяти умершего 25 августа 2008 года видного ученого, директора Института радиационной безопасности "Белрад", члена-корреспондента Национальной академии наук Беларуси Василия Борисовича Нестеренко.

Однако, к сожалению, в публикациях допущены обидные неточности, о которых необходимо сообщить читателям.

Так, в первой строке сообщения о смерти неправильно указано: *"Вядомы вучоны памёр у Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва спраў прэзідэнта пасля аперацыі на страўніку"*. Это не соответствует действительности, так как Василий Борисович Нестеренко перенес операцию на желудке и умер в Областной больнице в Боровлянах.

Далее в опубликованной ниже статье о В.Б.Нестеренко Е.А.Федюшина написано, что В.Б.Нестеренко дал согласие быть членом Международного совета "Ученые за безъядерную Беларусь". Я присутствовал при этом разговоре и знаю, что В.Б.Нестеренко такого согласия не дал.

А.Н.ДЕВОЙНО,
заместитель директора по научной работе Института радиационной безопасности "Белрад", профессор, доктор технических наук.

ПОГЛЯД

Ці не лепш цяпер сказаць праўду, чым заўтра расчароўваць людзей...

Да развалу Савецкага Саюза беларускія лясы былі напічканы ракетнай ядзернай зброяй. Нямала яе было і ў Брэсцкай вобласці, у тым ліку і ў баранавіцкіх лясах.

Калі потым, у адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі, было праведзена знішчэнне гэтай страшэннай зброі, у Паўночным мікраёне нашага горада як помнік таго, чым пагражала чалавецтву прымяненне яе, была ўстаноўлена выпатрашаная такая ракета — адна з многіх, якія ў 60-х гадах мінулага стагоддзя М.С.Хрушчоў "падараваў" Фідэлю Кастра для абароны Кубы ад ЗША. Дарэчы, яна добра ўпісалася ў архітэктуру горада.

І ўсё было б нічога, калі б нашым "выдатнейшым" гісторыкам не "стрэліла" ў галаву думка перанесці гэтую "ракету" на... міфічную "лінію Сталіна".

Міфічную таму, што ў сапраўднасці такой лініі ніколі не было. Збудаванне такога ваеннага ўмацавання было распачата незадоўга да вайны. І не толькі для абароны ад нападу немцаў, але і ад палякаў, якіх пасля драматычных падзей дваццатых гадоў вельмі баяліся бальшавікі; і ажно да пачатку Другой сусветнай вайны кожны год адзначаўся дзень вызвалення Беларусі ад белапалякаў (у адрыўных календарах, памятаю, гэта дата пазначалася чырвоным колерам).

Калі ж восенню 1939 года ў выніку адбыўшыхся тады вядомых падзей мяжа СССР (і Беларусі) была адсунута далей на Захад, так званая цяперашняя "лінія Сталіна" была дэманціравана, і ў далейшым, калі нямецка-фашысцкія захопнікі напалі на нашу краіну, абарончага значэння яна не мела, не стала перашкодай для іх імклівага прасоўвання ў кірунку сталіцы нашай рэспублікі. (Пасля непрацяглай абароны Мінска байцамі 100-й стралковай дывізіі немцы авалодалі горадам.)

Кажу гэта таму, бо тое-сёе ведаю пра тыя падзеі.

Наша былая невялічкая вёсачка Васільеўка знаходзілася на адлегласці 25—30 кіламетраў ад Магілёва (у бок Шклова). У першыя ліпеньскія дні праз яе (як і праз шмат іншых) ватагай праходзілі сотні чырвонаармейцаў, якім удалося вырвацца з варожага акружэння і якія трымалі накірунак у бок сваіх, каб зноў прымкнуць да Чырвонай Арміі. Але на іх шляху аказалася непераадольная перашкода ў выглядзе гітлераўцаў, якія з 4 па 27 ліпеня вялі кровапралітную бітву за Магілёў. І, не знайшоўшы выйсця, у сялянскіх сем'ях нашай вёскі засталіся татарын, чуваш і двое рускіх кадравых чырвонаармейцаў той жа дывізіі.

Мне тады было пятнаццаць гадоў, і я добра памятаю тое, што давялося ўбачыць і пачуць.

Гаворку пра перажытае ў першыя ваенныя дні часта вялі акружэнцы, якія засталіся ў нас, у маёй прысутнасці з маім братам Сяргеем, які быў на чатыры гады старэйшы за мяне і не намнога маладзейшым за іх. Яны прыходзілі да нас ці паасобку, ці па два-тры адначасова. І ў доўгія зімовыя вечары, седзячы ў халоднай хаце вакол да чырвані распаленай жалезнай печкі-буржуйкі, вялі нетаропкую гаворку пра перажытае, сітуацыю, у якой усе мы аказаліся падчас фашысцкай акупацыі. І я з вялікай цікаўнасцю слухаў іх, лавіў кожнае іх слова.

Да ўспамінаў пра ваенныя падзеі пад Мінскам акружэнцы вярталіся яшчэ і яшчэ многа разоў. Гэта была вельмі балючая для іх тэма.

Яны ваявалі ў розных падраздзяленнях згаданай дывізіі і бачылі тое, што адбывалася там, дзе яны знаходзіліся. І цяпер параўноўвалі тое, з чым кожны з іх сутыкнуўся, падводзячы падзеі да адной роўніцы. Іх вельмі абурала тое, што Мінск не быў абаронены, што на шляху наступаўшых з боку Брэста, Гродна, Вільнюса гітлераўцаў не было фартыфікацыйных умацаванняў, у распараджэнні нашых былі толькі наспех вырытыя акопы. І немцы ішлі без перашкод, як на шпацыры. Пра гэта я потым чуў і ад людзей тых месц, дзе праходзіць тая, уяўная "лінія Сталіна". Ніхто — ні яны, ні акружэнцы — не ўзгадвалі ні пра якую сур'ёзную перашкоду ў выглядзе абарончых умацаванняў. Ды ці ж можна ўзгадваць пра тое, чаго ў сапраўднасці не было. За лічаныя дні ад пачатку вайны да прыходу немцаў пад Мінск задзейнічаць тую ж "лінію Сталіна" было немагчыма.

Лінія няспраўджаных спадзяванняў — так можна назваць міфічную "лінію Сталіна". І гэта будзе больш дакладна і справядліва. Яна ўзнікла нядаўна ва ўяўленні згаданага сённяшняга "гісторыка". Гэта лінія вялікага фальшу, якая аддзяляе сапраўднае ад выдуманага.

Сённяшнія нашы ідэолагі вымушаюць маладых суайчыннікаў, якія не былі сведкамі тых падзей, паверыць у гэтую лухту. І яны, як у свой час мы, цяпер ужо старыя, верылі ў тое, што ўбівалі ў нашы галовы савецкія прапагандысты, прымаюць гэта за чыстую манету. Але, калі некалі здымецца ідэалагічная заслона і яны даведаюцца праўду, дык ад здзіўлення будуць пляваць на тое, што паказваюць ім сёння. Дык, можа, лепш ужо цяпер сказаць ім праўду, каб не расчараваць іх заўтра?

"Тэатралізаваныя" прадстаўленні на "лініі Сталіна" несвядомым маладым беларусам паказваюць тое, што павінна было быць, а не тое, што было ў сапраўднасці. Як, напрыклад, у супастаўленні даваеннага савецкага прапагандысцкага кінафільма "Если завтра война..." з сапраўднай вайной.

І жывую паказуху нашы больш сталага ўзросту людзі, якія многае пабачылі на сваім вяку, успрымаюць па-рознаму: адны безудзельна, абыякава, другія — з абурэннем, а іншыя — з насмешкай.

Ракету з нашага горада перавезлі туды ж, на "лінію". Для чаго?! Якое дачыненне яна мае да падзей мінулай вайны? Нашы гараджане вельмі абураны гэтым крокам тых, хто мае прамое дачыненне да здзейсненага кашчунства.

Міхаіл ЖУКАЎ,
пенсіянер, ветэран працы савецкага часу.

г.Баранавічы.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ

Что такое гаджеты?

Возможно, мой вопрос не совсем к "Народной воле", но все-таки... Уже несколько раз в журналах при описании новинок бытовой техники встречала слово "гаджеты", но, к сожалению, даже не представляю, что это. Может быть, вы подскажете?

Лариса Червоненко, г.Гродно.

Вообще-то, гаджеты — это самые разнообразные умные вещи, только маленькие, ограниченные в функциях. Это могут быть мобильные телефоны с добавочными функциями, смартфоны, коммуникаторы и так далее. Недавно, например, была представлена мини-стиральная машина, которую можно брать с собой в командировку или на отдых. Весит она всего 2 кг, надувная. Она ничуть не похожа на обычные стиральные машины. И внешне это скорее CD-плеер в сложенном виде.

В общем, в каждом конкретном случае под словом "гаджеты" может подразумеваться разная техника. Объединяет их только то, что они миниатюрные.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

ЧТО ТАМ, ЗА БУГОМ?

Успех на Венецианской архитектурной биеннале

Министр культуры и национального наследия Богдан Здроевский поздравил польских лауреатов премии "Золотой лев" на XI Международной Венецианской архитектурной биеннале.

Главной награды биеннале удостоен польский павильон, авторами художественного оформления экспозиции которого являются Гжегож Пионтек, Ярослав Трыбусь, Николя Гроспьер и Кобас Лякса.

В самом престижном смотре достижений мировой архитектуры принимали участие звезды современного зодчества и дизайна более чем из пятидесяти стран.

Международная выставка-ярмарка «Полагра»

В Познани состоялась международная выставка-ярмарка "Полагра".

Как сообщил ее директор Веслав Трава, выставка "Полагра" отразила новейшие тенденции на продовольственном рынке. Благодаря ей польские производители продуктов питания продвигают свои изделия. Во время "Полагры" встретились министры сельского хозяйства государств Вышеградской группы, а также Болгарии и Румынии.

Фестиваль науки

В Варшаве под девизом "Земля — наша планета" проходит фестиваль науки.

Как подчеркнула председатель совета фестиваля профессор Магдалена Фикус, программа очень богата и каждый найдет в ней что-то интересное для себя. В этом году программа фестиваля концентрируется вокруг явлений, происходящих на нашей планете, и влиянии человека на окружающую среду. Как отметила Магдалена Фикус, пройдут очень серьезные дебаты на тему климатических изменений и последствий человеческой деятельности.

Пикет корабелов

Более двухсот судостроителей из Польши, представляющих, в частности, заводы в Гдыне, Гданьске и Щецине, пикетировали здание Европейской комиссии в Брюсселе. "Мы прибыли сюда для того, чтобы просить Еврокомиссию о принятии положительного решения по делу польских судоверфей. Чтобы нам был предоставлен шанс работать. В случае отрицательного решения, как известно, мы будем вынуждены вернуть государственную помощь, а это означает банкротство", — сказал один из участников пикета.

Делегация польских корабелов была принята европейским комиссаром по вопросам конкуренции Нели Крус. "Я отдаю себе отчет, что для вас крайне важно, чтобы решение было принято как можно скорее. Мы приложим все усилия, с тем чтобы это произошло именно так. Но я хочу подчеркнуть, что положительное решение Комиссии связано с обеспечением рентабельности судоверфей в долгосрочной перспективе", — сказала на встрече с польскими судостроителями еврокомиссар Нели Крус.

Правительство Польши передало в Брюссель план реструктуризации польского судостроительного сектора. Ранее Еврокомиссия потребовала вернуть финансовую помощь в размере более 200 миллионов евро, предоставленную правительством Польши Гданьской судоверфи. Также Комиссия потребовала предоставить ей программу реструктуризации судоверфей в Гдыне и Щецине, которые на сегодняшний день продолжают дотироваться из госбюджета Польши, и ускорить сроки их приватизации.

КОРОТКО

Новый лидер

Правящая Либерально-демократическая партия Японии выбрала своего нового лидера — будущего премьер-министра страны.

Как сообщает AFP, им станет консерватор Таро Асо, бывший министр иностранных дел.

Протест Тегерана

Тегеран выразил официальный протест в связи с недавними заявлениями председателя Совета министров Италии Сильвио Берлускони, сообщило информационное агентство АНСА.

На встрече с членами известной еврейской организации "Керен Хайесод" Берлускони сравнил Махмуда Ахмадинежада с Адольфом Гитлером. Итальянский премьер не называл при этом их имен, однако из сказанного было очевидно, о ком идет речь.

Иранская сторона, по данным агентства, подчеркивает, что заявления Берлускони "не достойны итальянского народа и его богатой культуры".

Крутить педали лежа

В Кельне завершилась Международная ярмарка велосипедов. Около пятисот производителей со всего мира показали на ней свои новинки.

В центре внимания оказались электрические велосипеды. Самая интересная модель на ярмарке — JetStream. У него есть встроенный аккумулятор, а мотор размещен прямо во втулке заднего колеса.

Велосипеды с электромотором пользуются в мире все большей популярностью. В 2007 году только в Германии было продано около 65 тысяч электрических велосипедов, а в этом году, по оценкам экспертов, объем продаж превысит 100-тысячную отметку.

Помимо электровелосипедов большой интерес у посетителей ярмарки вызвали лигерады — это велосипеды, позволяющие ехать лежа на спине или на животе.

Арктика раскрывает объятия

Впервые в Арктике свободными ото льда оказались одновременно оба морских пути -- северо-восточный (северный морской путь) и северо-западный.

Подобного не было, возможно, в течение последних 100--125 тысяч лет со времени, предшествовавшего последнему ледниковому периоду.

Северо-восточный морской путь, проходящий вдоль северных берегов России, уже освобождался ото льдов в 2005 году. В свою очередь северо-западный морской путь, проходящий вдоль берегов Канады, также открывался в 2007 году, напоминает ИТАР-ТАСС.

Странная пара

Самый маленький в мире человек сфотографировался с самой длинноногой женщиной.

На Трафальгарской площади в Лондоне фотографы запечатлели до крайности странную пару, сообщает Sky News. На презентации очередного издания Книги рекордов Гиннесса вместе позировали самый маленький человек в мире Хэ Пинпин из Китая и обладательница самых длинных ног — Светлана Панкратова из Волгограда.

Рост Хэ Пинпина составляет всего 73 сантиметра, но он уже полгода встречается с женщиной нормального роста, по которой очень скучает. Длина ног Светланы Панкратовой достигает 132 сантиметров при росте 196 сантиметров. Будучи российской гражданкой, она уже долгое время проживает в Испании в курортном районе Коста-дель-Соль вместе со своим бойфрендом и занимается торговлей недвижимостью.

Тоннель под границей

Мексиканские власти обнаружили вблизи границы с Соединенными Штатами тоннель, который, как они полагают, рыли по заказу наркоторговцев, намеревавшихся переправлять через него свой товар.

Как пишет газета The Los Angeles Times, в связи с этим делом арестованы восемь человек, занимавшихся строительством тоннеля. Их задержали непосредственно под землей, во время работы.

Полицейские, проводившие задержание, сообщили, что вырытый проход по длине превышал длину футбольного поля и уже подходил к американской границе. Отмечается также, что тоннель был оснащен системой вентиляции и грузовыми лифтами.

Отмечается, что у границы с США время от времени находят подземные ходы, которыми пользуются члены наркокартелей.

УКРАИНА

Вновь досрочные выборы?

Украина вновь оказалась на пороге досрочных выборов. Они могут быть назначены президентом Виктором Ющенко, если в течение 30 дней в парламенте не будет сформирована новая коалиция. О коалиционных перспективах рассказывает корреспондент Радио Свобода.

Еще несколько дней назад считалось вполне вероятным объединение БЮТ с Партией регионов. Однако очевидно, что противников такого альянса немало внутри каждого из его вероятных участников. "Регионалы" размышляют, что для них сейчас более выгодно -- быть младшим партнером Тимошенко по коалиции или на выборах получить большинство голосов и снова посадить в премьерское кресло своего лидера Виктора Януковича.

Руководитель киевского Центра прикладных политических исследований "Пента" Владимир Фесенко считает, что в Раде может появиться и "очень широкой коалиция" в составе Блока Тимошенко, Партии регионов, коммунистов и Блока Владимира Литвина: "Такой вариант снимает часть проблем, но далеко не все. Поэтому я думаю, что переговоры будут идти, и, скорее всего, о решении мы будем знать не раньше октября. Рассматриваться будут все варианты. Очевидно, что "регионалы" -- и об этом было заявлено Виктором Януковичем, то есть был сделан очень прозрачный намек -- готовы договариваться с кем угодно".

В сугубо теоретическом плане можно представить себе и создание блока "регионалов" со сторонниками Ющенко. Однако в реальности представить такое весьма затруднительно -- Партия регионов призвала признать независимость Южной Осетии и Абхазии, а президент решительно поддержал Грузию в ее недавнем конфликте с Россией.

В президентской канцелярии заявляют, что Виктор Ющенко выступает за создание нового демократического большинства, основой для которого может стать союз НУНС и блоков Юлии Тимошенко и Владимира Литвина. Один из лидеров регионалов Александр Ефремов подвергает такую перспективу сомнению: "Там изначально заложен конфликт. И независимо от того, придет ли туда дополнительно 19 народных депутатов, этот конфликт исчерпан не будет".

Маловероятным такой формат большинства считает и Владимир Фесенко: "Мало делать заявления, надо делать практически шаги. По сведениям из разных источников, кроме заявлений, никаких реальных переговоров о создании коалиции БЮТ, НУНС и Блока Литвина не ведется".

Директор киевского Центра социальных исследований "София" Андрей Ермолаев предполагает, что коалиционные переговоры закончатся безрезультатно, а кроме досрочных выборов Украину может ожидать и новая конституционная реформа: "30 дней, которые положены на коалиционный процесс, уйдут на малопродуктивный переговорный процесс о коалиции. А с другой стороны, будет довольно плодотворная законодательная работа. Известно, что даже без коалиционных деклараций БЮТ и Партия регионов готовы к работе над конституционной реформой. И премьер-министр, и депутаты ПР заявили, что будут презентовать свои подходы к конституционной реформе. Можно предположить, что речь будет идти об усилении парламента, о более четком механизме формирования, функционирования парламентской коалиции, ее связей с правительством, о формировании единой исполнительной вертикали, в этой связи об усечении полномочий президента. Возможно, будет обновлено выборное законодательство.

Это те направления, по которым возможен политический компромисс. Особенность ситуации состоит в том, что президент Украины не имеет полномочий ветировать конституционные изменения. Даже готовясь к досрочным парламентским выборам, две самые крупные политические силы в парламенте внесут первичные изменения, которые будут требовать потом уже оформления следующим составом парламента, после чего начнется новый отсчет политической системы".

Как бы ни развивались события, большинство экспертов полагает, что президент Виктор Ющенко не сможет выиграть схватку за власть у премьера Тимошенко.

Владимир ИВАХНЕНКО.

Немецкий эксперт: «Запад не знает, что делать?»

Свое мнение о политическом кризисе в Украине и его последствиях для отношений с Западом высказывает в интервью Deutsche Welle эксперт немецкого фонда "Наука и Политика" Райнер Линднер.

— В Украине происходит дестабилизация политического пространства и перераспределение политических игроков. Мне кажется, что политический кризис только начинается, — заметил эксперт.

— Не исключено, что Блок Юлии Тимошенко образует новую коалицию со своим давним противником — Партией регионов. Вам не кажется противоестественным подобный альянс?

— Я думаю, что Блок Юлии Тимошенко объединится с определенными политиками из разных партий, в том числе и из Партии регионов. С другой стороны, сейчас формируются новые политические силы, которые будут противостоять этой коалиции.

— На политической карьере нынешнего президента Украины Виктора Ющенко можно ставить крест?

— Нет, пока он сам еще не определился, будет ли он участвовать в новой коалиции и выдвинет ли он вновь свою кандидатуру на пост президента. Я думаю, что в настоящее время идут переговоры с разными политическими силами. Исходя из нынешнего рейтинга Ющенко, его шансы стать президентом несколько ограничены. Но и окончательно списывать его со счетов рано. Мы знаем, что ему удалось вывернуться из похожей ситуации в 1996 году и стать президентом.

— В Европе придется выбирать себе новых фаворитов в Украине. Кого поддержит в итоге Запад?

» Запад сейчас разочарован Украиной. Мы бы хотели начать новый процесс, направленный на сближение с Евросоюзом и НАТО. Но ввиду напряженной внешнеполитической ситуации нам бы хотелось, чтобы в Украине было создано стабильное правительство. Поэтому мы не думаем о том, кто будет в новой коалиции, кто будет задавать тон в новом парламентском большинстве или кто будет новым президентом. Главным вопросом является то, как нам в принципе дальше поступать в отношениях с Украиной.

Беседовала Элеонора ВОЛОДИНА.

Грузинский кризис разбил коалицию в Киеве

Кризис в Грузии стал катализатором этого второго развода. Президент однозначно — что неудивительно — встал на сторону своего коллеги из Тбилиси, тогда как Юлия Тимошенко заняла нейтральную позицию, которую Виктор Ющенко назвал "государственной изменой", напоминает LE TEMPS.

"Кризис в Грузии — всего лишь предлог к развалу коалиции. Напряженность в отношениях главы украинского государства и премьер-министра присутствовала уже давно", — считает Лора Делькур, научный сотрудник Института международных и стратегических исследований в Париже. Она напоминает, что в мае сторонники Юлии Тимошенко не дали Виктору Ющенко выступить с традиционной речью перед Радой.

В большей степени, нежели идеологическими причинами, хрупкость "оранжевого" альянса объясняется чрезмерными личными амбициями двух главных оппонентов. "Мы являемся свидетелями борьбы за власть, которая активизируется накануне президентских выборов, назначенных на 2010 год, — продолжает Лора Делькур. — Такой ситуации благоприятствуют институциональные условия. Конституция, вступившая в силу в 2006 году, является плодом компромисса между президентом и оппозицией. Она наделяет властью одновременно и главу государства, и Раду, что в значительной степени дестабилизирует политическую ситуацию". Принятая в начале сентября серия законов, направленных на ограничение полномочий президента, подлила масла в огонь. За эти тексты проголосовала пророссийская оппозиция и сторонники Юлии Тимошенко.

Теперь вырисовывается несколько возможных сценариев. Сближение главы правительства — гораздо более популярной, чем Виктор Ющенко, — и пророссийской Партии регионов: противоестественно, но возможно. Досрочные выборы, уже вторые в этом году: конституция предусматривает проведение голосования, если новая правящая коалиция не будет сформирована в течение 30 дней после распада предыдущей. "Юлия Тимошенко, несомненно, стремится к единоличной власти, — считает Андре Либих, профессор Института высших международных исследований и развития в Женеве. — Она может противостоять Виктору Ющенко, не формируя нового большого союза, при условии сближения с несколькими мелкими партиями".

Каким бы ни был исход кризиса, Украина рискует оказаться как никогда раздираемой между Европой и Россией. "Ситуация очень напряженная, — добавляет специалист по Кавказу. — Черное море превратилось в центр потенциального конфликта. Киев испытывает сильное давление тех, кто за вступление в НАТО, с одной стороны, и тех, кто против этого, — с другой. Третьего пути не дано. В данных обстоятельствах не вступать — это уже выбор". А если Москва будет и дальше усиливать свои позиции, она не даст Украине уйти. "Это историческая колыбель России", — подчеркивает Лора Делькур. "Это стратегическая страна, — добавляет Андре Либих. — Большая, богатая, здесь живет русскоговорящее население". Большинство украинцев — не обязательно пророссийски настроенных — выступает против вступления в НАТО, за которое ратует их президент.

КАЛЕЙДОСКОП

Мухаммед популярнее Адама

Самым популярным именем, которое давали новорожденным мальчикам в Брюсселе, который считается столицей Европейского Союза, в 2007 году было Мухаммед, сообщает DPA. Вторым по популярности именем в бельгийской столице оказалось Адам.

Во всей Бельгии имя Мухаммед оказалось седьмым, более популярным, чем традиционные бельгийские имена Матис и Гуго. Имя Мухаммед (с различными вариациями: Мохаммед, Мухаммад и другими) по итогам 2007 года стало вторым по популярности в Великобритании, опередив традиционные английские имена.

Банковский Робин Гуд

Британский банковский менеджер из альтруистических побуждений перераспределил между богатыми и бедными клиентами своего банка более семи миллионов фунтов стерлингов, пишет газета The Daily Telegraph.

Как было установлено в ходе судебного разбирательства, 39-летний Бенедикт Хэнкок, один из ведущих сотрудников второго по величине банка Великобритании Royal Bank of Scotland с зарплатой 49 тысяч фунтов в год, в течение нескольких лет переводил на счета корпоративных клиентов, попавших в затруднительное положение, деньги со счетов более успешных компаний. При этом в большинстве случаев ограбленные Хэнкоком клиенты даже не замечали исчезновения средств. Если же они начинали задавать вопросы, Хэнкок говорил им, что деньги инвестированы в очень надежные облигации, и клиенты успокаивались.

Сам Хэнкок, как было доказано в суде, не получал от этих операций никакой финансовой выгоды и руководствовался лишь желанием помочь попавшим в беду компаниям пережить тяжелые времена.

Попался Хэнкок, которого издание называет современным Робин Гудом, когда один из клиентов банка обнаружил, что его счет уменьшился на пять миллионов фунтов. Внутреннее расследование выявило, что эти средства плюс еще свыше миллиона фунтов, взятых со счета другого клиента, перевел именно Хэнкок.

Суд приговорил Хэнкока к полутора годам тюрьмы.

Собака вызвала «скорую»

Немецкая овчарка по кличке Бадди спасла жизнь своему хозяину, набрав телефон службы спасения. Дрессированный пес сумел попасть по клавишам 911 и вызвать "скорую помощь" к американцу Джо Сталнакеру, когда его хватил удар, сообщает AP.

Полиция прибыла в дом Сталнакера через несколько минут после звонка. Перенесшему удар американцу пришлось провести в больнице двое суток.

Собака Бадди была специально обучена набирать телефон службы спасения в случае, когда хозяин почувствует себя плохо. При этом диспетчер, принявший звонок от овчарки, заявил, что даже старожилы не припомнят случая, когда животные вызывали "скорую" для своих владельцев.

Поймали бандита-макаку

Китайским полицейским в результате спецоперации удалось поймать самца большой макаки, который долгое время разбивал окна и крал продукты в домах жителей города Чунцина на юге страны. В настоящий момент обезьяну поместили в местный зоопарк, сообщает газета "Чайна Дэйли".

Проделки животного серьезно разозлили местных жителей, но полиция и служба ветеринарного контроля Чунцина были практически бессильны и не могли изловить изворотливое животное. В конце концов, на помощь местным властям пришли ученые-биологи. Они предложили заманить примата в "медовую ловушку", подсадив ему самку обезьяны.

Способ, предложенный учеными, сработал: полицейские схватили макаку, когда ее внимание было занято самкой.

Теперь обезьяна-хулиган помещена под стражу в клетку в местном зоопарке.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ЧУЛІ?

Справа аб «жывым шчыце» зноў у судзе

25 верасня ў судзе Мінскага раёна і горада Заслаўе адбудзецца папярэдняе слуханне па грамадзянскай справе аб "жывым шчыце".

Пацярпелыя патрабуюць кампенсацыі матэрыяльных страт у выніку аварыі. Пра гэта паведаміла адвакат Вера Страмкоўская: *"На 25-га выклікаюць на папярэдняе слуханне, на якім суддзя высвятляе ў бакоў, якія ёсць дакументы, доказы, што патрэбна дадаткова запатрабаваць. Падаваць доказы ў грамадзянскім працэсе павінны самі бакі, суд толькі разглядае гэтыя матэрыялы"*.

Нагадаем, сёлета 25 чэрвеня былі асуджаны два супрацоўнікі ДАІ, якія прымалі ўдзел у арганізацыі "жывога шчыта". Але на тым працэсе пытанне пра кампенсацыі не разглядалася.

"Маральную шкоду спагналі падчас крымінальнага працэсу, а тое, што тычыцца матэрыяльнай шкоды — якія пашкоджанні ў машыны і гэтак далей, — гэта ўсё будзе ў грамадзянскім працэсе. Ён вылучаны з крымінальнага ў асобную вытворчасць", — гаворыць адвакат пацярпелых.

Адказчыкамі ў грамадзянскім працэсе выступіць ДАІ і страхавая кампанія.

Дарэчы, на мінулым тыдні з Расіі ў Мінск быў экстрадзіраваны віноўнік "жывога шчыта" Раман Мянцюк. Зараз ён знаходзіцца ў следчым ізалятары на вуліцы Валадарскага.

Бацька галоўнага кандыдата на пасаду прэм'ер-міністра Ізраіля нарадзіўся ў Гродна

Цыпі Ліўні можа стаць новым прэм'ер-міністарам Ізраіля. З перавагай трохі больш, чым адзін працэнт, на праймерыз кіруючай партыі "Кадыма" міністр замежных спраў Ізраіля абышла міністра транспарту Шаўля Мафаза.

Нагадаем, Эгуд Ольмерт, дзейны прэм'ер-міністр, пасля карупцыйнага скандалу быў вымушаны падаць у адстаўку і прызначыць выбары свайго наступніка на пасадзе партыйнага лідэра. Цяпер, як кіраўніца найбольш вялікай фракцыі ў парламенце, Цыпі Ліўні мусіць сфарміраваць кааліцыю і новы ўрад.

Калі ў яе гэта атрымаецца, дык Ліўні зробіцца другой пасля Голды Меір жанчынай-прэм'ерам за ўсю ізраільскую гісторыю. У кар'еры дзвюх жанчын шмат падобнага. Абедзве кіравалі міністэрствамі замежных спраў. Да таго ж, як і Голда Мэір, якая колькі год жыла ў Пінску, Цыпі Ліўні таксама мае дачыненне да Беларусі — яе бацька Эйтан нарадзіўся ў Гродна ў 1919 годзе.

Мінчукі судзяцца з метрапалітэнам з-за дамоў, якія ідуць пад знос

У Мінску пачаліся суды вакол зямельных участкаў, якія знаходзяцца на шляху будаўніцтва новых станцый метро. УП "Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна" спрабуе выселіць з дамоў грамадзян, якія патрабуюць раўнацэннай кампенсацыі іх уласнасці.

Гаворка ідзе пра зямлю, якая знаходзіцца на лініі будаўніцтва метро "Інстытут культуры" — "Пятроўшчына". Спачатку ўладальнікам прыватных дамоў, якія ідуць пад знос, паабяцалі, што яны атрымаюць новыя дамы. Але пасля таго, як людзі падпісалі дакументы, у якіх узгаднілі знос, правілы гульні пачалі мяняцца.

Аказваецца, Мінгарвыканкам не мае магчымасці прадаставіць ім новыя дамы, таму людзям прапануюць засяляцца ў кватэры. Некаторыя пагадзіліся з гэтым, іншыя вырашылі праз суд дамагчыся выключэння іх участкаў з ліку земляў, якія забіраюцца для будаўніцтва метрапалітэна.

У адказ УП "Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна" падало ў суд пазоў аб высяленні ўпартых землеўладальнікаў. Папярэднія слуханні справы пакуль вынікаў не далі.

"Народная воля" будзе сачыць за развіццём падзей.

Таксі падаражэе пасля выбараў

Мінгарвыканкам адклаў прыняцце рашэння аб павышэнні тарыфаў на паслугі легкавых таксі. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні камітэта эканомікі — начальнік упраўлення цэнавой палітыкі Мінгарвыканкама Іосіф Рачыцкі.

Як паведамлялася раней, аператары таксі ў Мінску падалі дакументы на павышэнне тарыфаў на праезд. Дырэктару асацыяцыі "Сталічнае таксі" Станціну Кузьмянкову ў Мінгарвыканкаме заявілі, што рашэнне адкладзена да асаблівых распараджэнняў.

Паводле слоў І.Рачыцкага, Міністэрства эканомікі адклала прыняцце рашэння аб павышэнні тарыфаў на паслугі маршрутных таксі. "Калі будзе прынята рашэнне па маршрутных таксі, мы вернемся да разгляду пытання па легкавых таксі", — патлумачыў І.Рачыцкі.

Апошняе павышэнне тарыфу на праезд у таксі было 5 лістапада 2007 года. Тады праезд падаражэў на 20%. Цяпер тарыф складае 1320 рублёў за адзін кіламетр.

У асацыяцыю "Сталічнае таксі" ўваходзяць 20 аператараў, якія прадастаўляюць паслугі таксі ў Мінску.

Марына НОСАВА.

СКАНДАЛ

«Польскі бок прапанаваў нам здацца»

Непрызнаны беларускімі ўладамі Саюз палякаў Беларусі не пагадзіўся на перамовы з афіцыйным Саюзам палякаў. Пайсці на такі крок кіраўніцтву непрызнанага ў Беларусі Саюза параілі ў Міністэрстве замежных спраў Польшчы. Да гэтага часу польскі бок падтрымліваў структуру, якую, у сваю чаргу, не прызнавала беларускае кіраўніцтва.

Скандальная сітуацыя мела такі рэзананс, што ўмяшацца прыйшлося польскаму амбасадару ў Беларусі Хенрыку Ліцвіну і прэм'ер-міністру Польшчы Дональду Туску.

ДАВЕДКА "НАРОДНАЙ ВОЛІ"

У 2005 годзе на чарговым VI з'ездзе Саюза палякаў Беларусі кіраўніком арганізацыі была абрана Анжаліка Борыс. Аднак Міністэрства юстыцыі прызнала нелегітымным новае кіраўніцтва Саюза, беларускія ўлады настаялі на правядзенні паўторнага з'езда, на якім кіраўніком ужо быў абраны Юзэф Лучнік. Аднак нямала сябраў арганізацыі засталіся з непрызнаным уладамі Саюзам, у тым ліку і заснавальнік СПБ Тадэвуш Гавін.

Неафіцыйны Саюз палякаў падтрымала і кіраўніцтва Рэспублікі Польшча.

Як вядома, з 2005 года на Беларусі існуе два Саюзы палякаў Беларусі. Неафіцыйны, якім кіруе Анжаліка Борыс, і афіцыйны, прызнаны беларускімі ўладамі, які ўзначальвае Юзэф Лучнік. На мінулым тыдні нечакана для сябраў непрызнанай на Беларусі арганізацыі яе кіраўніка Анжаліку Борыс і актывістаў арганізацыі запрасілі ў польскі МЗС і фактычна прапанавалі аб'яднацца з афіцыйным Саюзам палякаў, патлумачыўшы, што гэты крок паспрыяе пацяпленню польска-беларускіх дачыненняў і робіцца ён выключна на карысць геапалітычных інтарэсаў. Гэтая размова адбылася за некалькі дзён да вядомай, але мала афішаванай сустрэчы ў Віскулях міністраў замежных спраў Польшчы і Беларусі Радаслава Сікорскага і Сяргея Мартынава.

Менавіта гэтая акалічнасць стала падставай для з'яўлення ў польскім папулярным выданні "Rzeczpospolita" артыкула пад назвай "Міністэрства замежных спраў Польшчы гатовае "прадаць" Анжаліку Борыс".

У мінулую суботу была склікана Рада неафіцыйнага Саюза палякаў, на якую з Мінска прыехаў амбасадар Польшчы ў Беларусі Хенрык Ліцвін.

— Амбасадар яшчэ раз патлумачыў пазіцыю польскага боку, — расказаў прэс-сакратар непрызнанага Саюза палякаў Беларусі Ігар Банцар. — Маўляў, вам ніхто нічога не прапаноўвае, мы на вас не націскаем, але Еўропа з Беларуссю дамаўляецца, Польшча з Беларуссю дамаўляецца, і было б выдатна, калі б нейкія крокі ў гэтым накірунку зрабіў і Саюз палякаў...

Рада не супраць размаўляць з беларускімі ўладамі, мы адкрытыя для супрацоўніцтва, але пры чым тут праўладны Саюз палякаў? Сітуацыя 2005 года была цалкам зрэжысіравана беларускімі ўладамі, было відавочна, як усё адбывалася, як быў прызначаны, а не абраны старшынёй (мы па-ранейшаму ўпэўненыя ў гэтым) спадар Лучнік. Але прайшло некалькі год, і Міністэрства замежных спраў Польшчы нібыта забылася пра гэта. Польскі бок фактычна прапаноўвае нам здацца. Але Рада не падтрымала такую ініцыятыву, фарміраваць рабочую групу для перамоў з праўладным Саюзам мы не будзем, але не адмаўляемся ад дыялогу непасрэдна з уладамі.

— На ваш погляд, які працяг можа мець дадзеная сітуацыя?

— Зараз у Польшчы знаходзіцца Анжаліка Борыс, ёй прызначана сустрэча з прэм'ер-міністрам Польшчы Дональдам Тускам. Магчыма, калі гэты нумар ужо трапіць да вашых чытачоў, будуць вядомы падрабязнасці гэтай сустрэчы. Але я мяркую, што наша пазіцыя не зменіцца. Вельмі ўразіла і радуе тое, што нас падтрымалі тысячы палякаў, якія жывуць у Беларусі і нават Польшчы, бо там людзі таксама дзякуючы тэлебачанню і газетам ведаюць пра нашу сітуацыю і шмат хто разглядае яе як здраду Саюзу палякаў, якім кіруе Анжаліка Борыс.

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

Тадэвуш Гавін: «Сітуацыю трэба вырашаць, немагчыма яе кансерваваць»

— Я мяркую, што польская дыпламатыя хацела, як лепей, і робіць усё магчымае, каб легалізаваць Саюз палякаў Беларусі, які ўзначальвае Анжаліка Борыс, — кажа заснавальнік Саюза палякаў Беларусі і яе першы кіраўнік Тадэвуш Гавін. — У сакавіку 2005 года Борыс выйграла выбары, і гэта не падлягае сумневу. Я неаднойчы сцвярджаў і пісаў аб тым, што сітуацыя, якая ўзнікла вакол нашай грамадскай арганізацыі, была цалкам справакавана беларускімі ўладамі і спецслужбамі. Але надалей так заставацца не можа. Сітуацыю трэба вырашаць, немагчыма яе кансерваваць. Гэта ненармальна, калі мы адзначаем 20-годдзе Саюза палякаў Беларусі і ўлады не толькі не даюць нам памяшканне, дзе б мы маглі правесці ўрачыстасці, а болей за тое, ціснуць на людзей і нават каталіцкіх святароў...

Таму не трэба здзіўляцца, што польскі бок прыкладаў і прыкладае намаганні, каб Анжаліка Борыс магла кіраваць Саюзам у нармальных умовах..

— А вас не здзіўляе, што такая прапанова прагучала менавіта зараз, калі Польшча і іншыя краіны Еўрапейскага Саюза кажуць пра магчымае аднаўленне дыялогу з беларускай уладай?

— Польскі бок заўсёды ставіў перад уладамі Беларусі пытанне аб Саюзе палякаў Беларусі і казаў, што пацяпленне ў адносінах паміж афіцыйным Мінскам і Варшавай немагчыма без вырашэння пытання польскай нацыянальнай меншасці: калі польскія школы, польскія Дамы, якія павінны быць у Саюза палякаў Анжалікі Борыс, фактычна скрадзены і знаходзяцца ў руках групы людзей, якія нічога не робяць для польскага нацыянальнага адраджэння. Дастаткова толькі паехаць у горад Браслаў і паглядзець, у якім стане там знаходзіцца Дом польскі — з выбітымі вокнамі, амаль год без ацяплення...

— Але ж размова ішла не пра тое, каб легалізаваць непрызнаны Саюз палякаў Беларусі, а пра тое, каб стварыць амаль новую арганізацыю з новым кіраўніцтвам?

— Размова якраз такі ішла пра тое, як легалізаваць Саюз. Асабіста я нічога не бачу страшнага ў тым, каб стварыць групу для перамоў з прадстаўнікамі праўладнага Саюза для выпрацоўкі ўмоў правядзення новага выбарчага з'езда арганізацыі — а менавіта з такой ініцыятывай і выступаў польскі бок. Дзеля справы можна сесці за стол перамоў і з гэтымі, буду шчырым, непаважанымі людзьмі. Калі б дыялогу не атрымалася, тады б мы маглі дабівацца перамоў з беларускімі ўладамі... Кіраўніцтва Саюза на чале з Анжалікай Борыс павінна вярнуцца ў галоўны офіс СПБ, дзе зараз знаходзяцца кіраўнікі прызначанага беларускімі ўладамі так званага Саюза палякаў Беларусі. Нам павінны вярнуць усю тую маёмасць, якую здабыў Саюз і якую ў яго адабралі.

Я ўпэўнены, што Борыс выйграла б новыя выбары, калі б выставіла сваю кандыдатуру. За ёй і яе людзьмі сіла і праўда. Сённяшнія кіраўнікі праўладнага Саюза палякаў не карыстаюцца аўтарытэтам у польскага насельніцтва краіны, яны не прымаюць ніякіх рашэнняў, накіраваных на паляпшэнне спраў у накірунку адраджэння польскай меншасці ў Беларусі. Тым больш што ў нашай арганізацыі галасы на з'ездах заўсёды падлічваюцца абранымі кандыдатамі, і розныя маніпуляцыі і фальсіфікацыі здзейсніць у такіх умовах немагчыма. Больш за тое, гэты з'езд можна было б правесці пад кантролем грамадскіх арганізацый Польшчы і Беларусі і выключыць з працэсу улады абедзвюх краін.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ГЛЫБІНКА

Гаротны лёс чатырох дзятлаўскіх вёсак

У адным з нумароў дзятлаўскай раённай газеты прачытала аб'яву-заклік. Прыводжу дослоўна: "Да ведама грамадзян! У сувязі з адсутнасцю асфальтавага пакрыцця ў вёсках Лозкі, Лявонавічы, Скіпоравічы, Малдавічы і ў сувязі з неаднаразовымі зваротамі жыхароў гэтых вёсак у мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы Казлоўшчынскі пасялковы выканаўчы камітэт просіць усіх вадзіцеляў аўтатранспартных сродкаў абмяжоўваць хуткасць руху да сарака кіламетраў у гадзіну пры руху праз вышэйназваныя вёскі або рухацца па аб'язных дарогах.

Гэта просьба выклікана тым, што жылыя дамы ў вёсках Лозкі, Лявонавічы, Скіпоравічы і Малдавічы размешчаны паблізу праезнай часткі дарог, а вялікае скапленне пылу, выкліканае рухам аўтатранспартных сродкаў, парушае жыццядзейнасць пражываючых там людзей".

Іншымі словамі, ездзіце, людзі, памалу або загуменнямі.

Каб не ўказальнікі, то старонні чалавек і не разабраўся б, дзе канчаецца адна вёска і пачынаецца другая — настолькі яны злучаны. Злучаны не толькі геаграфічным становішчам, але і агульным лёсам: усе чатыры вёскі імкліва вымі раюць. Нібы якая напасць на іх: і ў сухое надвор'е пыл такі, што ні бялізну высушыць, ні акно адчыніць, і вада ў калодзежах смярдзючая, бо сцякае з палёў, пасыпаных рознымі ўгнаеннямі, гербіцыдамі.

Да нядаўняга часу лёс усіх гэтых вёсак быў больш ласкавы. У Лявонавічах размяшчаўся цэнтр калгаса "Іскра". Узвялі двухпавярховы будынак, дзе месцілася праўленне гаспадаркі, клуб, бібліятэка. Тут меўся быць аграгарадок, ужо і новыя жылыя дамы ўпрыгожвалі вясковы пейзаж. "А раз аграгарадок, то і водаправод будзе, і асфальт пракладуць", — радаваліся мясцовыя жыхары. Аднак радасць гэта была заўчаснай: калгас далучылі да суседняга з назвай "Слава працы" і цэнтрам у пасёлку Казлоўшчына. Чатыры вёскі засталіся на абочыне жыцця. Некаторыя яе жыхары яшчэ вераць абяцанням, што аграгарадок у Лявонавічах усё ж будзе, некаторыя перасталі на гэта спадзявацца.

У самым пачатку Лявонавіч непадалёку ад магазіна вісіць лозунг: "Хвала рукам, што пахнуць хлебам". Ён аблез і саржавеў. Няма працавітым рукам ніякай хвалы. Проста словы. А каб гэтая хвала была на справе, то не так дажывалі б свой век састарэлыя вяскоўцы, што і хлеб вырошчвалі, і жывёлу даглядалі, і на ўласным падвор'і працавалі да знямогі. Нават старонняму чалавеку балюча глядзець на тое, што сталася з вёскамі. А што ўжо казаць пра тых, хто тут нарадзіўся і адпрацаваў усё свядомае жыццё, хто працуе і цяпер. Двухпавярховы адміністрацыйны будынак, дзе быў і клуб, і бібліятэка апусцеў і паволі развальваецца. Калгас аб'ядналі, і кантора пераехала. Мясцовую сярэднюю школу, у якой цяпер 88 вучняў і колькасць іх кожны год змяншаецца, аб'ядналі з дзіцячым садком, які наведваюць дзесяць малышоў. Памяшканне садка стала пустым, і ў яго перасялілі клуб і бібліятэку. Але толку мала, бо ў гэтых так званых ачагах культуры няма святла. Калі садок выселіўся, знялі электралічыльнік. На дварэ восень, дні становяцца кароткімі. Бібліятэка працуе да сямі гадзін, а ў гэты час ужо амаль цёмна. Хутка цёмна будзе і ў чатыры гадзіны.

Мясцовыя жыхары ўжо забыліся, калі ім у апошні раз паказвалі кіно. Для моладзі, якая яшчэ крышку засталася ў вёсцы, няма магчымасці праводзіць танцы, і яна едзе каратаць вольны вечар то ў пасёлак Казлоўшчына, то ў вёску Вензавец, якія знаходзяцца далекавата.

У Лозках і ў Малдавічах ёсць фельчарска-акушэрскія пункты, а ў бальніцу і паліклініку трэба ехаць у Казлоўшчыну. За два дзесяцігоддзі там у рэшце рэшт пабудавалі новы будынак медыцынскай установы, але справа ў тым, што бальніца і паліклініка хоць і называюцца Казлоўшчынскімі, але размешчаны за два кіламетры ад пасёлка. Даехаць туды няма на чым, а састарэлым і нямоглым людзям такі шлях пераадолець цяжка.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў гэтых вёсках некалі быў асфальт. Мясцовыя людзі ведаюць, як гэта зручна. Толькі з цягам часу асфальтавае пакрыццё павыбівалася, утварыліся ямы. Трэба было класці новае, але замест гэтага на вуліцы вёсак навезлі жвіру і разраўнялі. Ездзіць стала зручней, але цяпер у сухое надвор'е ад пылу няма чым дыхнуць, а калі задажджыць — вуліцы ператвараюцца ў месіва.

З вадой таксама сітуацыя вельмі складаная: верхаводка прэ ў калодзежы ўсялякую брыдоту. Піць немагчыма. Вяскоўцы са сваёй невялікай пенсіі вымушаны купляць бутляваную ваду, але ў мясцовым магазіне яна бывае не пастаянна. Ды і хіба гэта выйсце са становішча?

— Дзецям у школе загадалі, каб куплялі ваду ў бутэльках, — расказвае адна маладая мама. — Пайшла ў магазін, а там разабралі. Прыйшлося ў Дзятлава ехаць і адтуль цягнуць.

Ужо шмат гадоў запар у Лявонавічах не працуе лазня. Жыхары Скіпоравіч і Малдавіч мыюцца ў Скіпоравіцкай лазні, а людзі з Лявонавіч і Лозак абыходзяцца начоўкамі.

Жыхары чатырох вёсак, што называецца, дасталі ўсіх сваімі скаргамі. Найбольш, вядома, выканкам Казлоўшчынскага пасялковага Савета, на тэрыторыі якога яны апынуліся пасля таго, як ліквідавалі Гярбелевіцкі сельскі Савет. Але што можа зрабіць старшыня пасялковага Савета, калі няма грошай? Нічога не можа. Толькі папрасіць усіх, каб не ездзілі праз вёску, а пылілі загуменнямі. Ды справа ў тым, што па загуменні ездзіць ніхто не хоча, бо гэта нязручна. Асабліва тыя людзі, якія тут не жывуць. Ды іх і папракаць за гэта неяк няёмка.

Рэагуючы на скаргі мясцовых жыхароў, у пачатку Лявонавіч паставілі знак, які забараняе праезд грузавому транспарту. Але як вяскоўцам абысціся без яго?

Ніякага дзіва няма ў тым, што мясцовыя людзі як могуць уцякаюць з вёсак. Старыя дажываюць свой век, а што тут можа ўтрымаць моладзь? Ні кіно, ні танцаў. Ды што там, нават вады папіць немагчыма. Шкада. Бо людзі тут жывуць цудоўныя — працавітыя, акуратныя, добразычлівыя. Паглядзелі б вы, які парадак і чысціня ў бібліятэцы, у Лявонавіцкай школе! А ля школы такі цудоўны дыван з кветак, нібыта ў казцы. Ля кожнага дома сад, дагледжаны руплівымі рукамі вяскоўцаў. Гэтым людзям і сапраўды павінна быць вялікая хвала і гонар. На вялікі жаль, усё складваецца зусім інакш.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

ЗДАРЭННІ

Француз катаўся на ровары і заехаў у Беларусь

За парушэнне польска-беларускай мяжы 17 верасня брэсцкімі памежнікамі быў затрыманы грамадзянін Францыі.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, мужчына патлумачыў, што знаходзіўся на тэрыторыі Польшчы з турыстычнай мэтай. У час катання на ровары ён заблукаў і парушыў дзяржаўную мяжу.

Замежны грамадзянін прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе папярэджання і перададзены прадстаўнікам памежнай варты Польшчы.

Лось пайшоў на таран

Тры аўтамабілі збіў з дарогі лось перад тым, як загінуць. Адбылося гэта адвячоркам каля Нясвіжа.

Кіроўца "Масквіча", які рухаўся з Гарадзеі, не паспеў зрэагаваць, калі лось выбег на дарогу. Машына адкінула лася на сустрэчную паласу пад колы грузавіка "Вольва", які ехаў з Нясвіжа. "Вольва" кінула лася зноў на другую паласу, дзе жывёла наляцела на "Фальксваген". Лось загінуў, людзі не пацярпелі, машыны патрабуюць рамонту.

У ЗША загінуў сын эмігранта з Беларусі

Трагічная гібель у ЗША трохгадовага Марцена Кудліса, сына эмігранта з Беларусі, актуалізавала праблему нелегальных мігрантаў у Злучаных Штатах.

Здарэнне адбылося ў горадзе Аўрора штат Каларада. 23-гадовы нелегал з Гватэмалы, які не меў правоў кіроўцы, справакаваў аварыю, у выніку чаго іншы аўтамабіль пратараніў кавярню. На месцы загінулі дзве жанчыны, хлопчык памёр у бальніцы.

Паведамляецца, што бацька Марцена выехаў у ЗША з Беларусі яшчэ ў савецкія часы, а маці-эстонка пераехала туды 9 гадоў таму.

Здарэнне ў Аўроры выклікала цэлую хвалю публікацый у амерыканскіх СМІ, а апазіцыя жорстка крытыкуе ўлады штата за занадта лаяльныя адносіны да нелегалаў.

КАДРЫ

Геннадий Невыглас с головой ушел в футбол. Пока

Экс-глава Администрации президента теперь почти каждый день появляется в офисе Белорусской федерации футбола. А сразу после отставки он ненадолго уехал в деревню Парохонск Пинского района Брестской области, где живет его мать.

"Теперь его здесь нет, — сказали "Народной воле" в родительском доме Невыгласа. — Его надо искать на работе. А сюда он иногда звонит. Ищите его в Минске. После отставки он здесь недолго гостил — ему же на работу надо..."

Однако обсуждать свое прошлое и будущее с журналистами генерал Невыглас не желает.

В Белорусской федерации футбола секретарь Геннадия Невыгласа пару раз сообщила "Народной воле", что ее начальник чрезвычайно занят: у него, мол, совещания. А на следующий день объявила, что все контакты с прессой — исключительно через пресс-секретаря.

Недавно назначенный пресс-секретарь Белорусской федерации футбола сказала, что Геннадий Невыглас появляется на работе каждый день.

"Геннадий Николаевич — страстный болельщик, прекрасно разбирается в футболе, а обижен он на кого-то или нет — сказать не могу: я его недостаточно хорошо знаю, работаю в этой должности совсем недавно", — сказала Татьяна Пышкало.

Как написано в президентском указе, освобождение Невыгласа с должности главы Администрации президента связано "с переводом на другую работу". Так что, скорее всего, через пару месяцев Невыгласа назначат на новую, хорошо оплачиваемую государственную работу. Поэтому он и молчит...

Марина КОКТЫШ.

ДОСЬЕ

В марте минувшего года на отчетно-выборной конференции ассоциации "Белорусская федерация футбола" Геннадия Невыгласа на безальтернативной основе переизбрали председателем. Впервые генерал Невыглас возглавил белорусский футбол в 2003 году - - тогда он занимал должность государственного секретаря Совета безопасности.

Должности главы Администрации президента Невыглас лишился в июле этого года.

СЛЫШАЛИ?

Более 130 человек отбывают в Беларуси пожизненное наказание

На сегодняшний день пожизненное наказание в Беларуси отбывают более 130 человек, сообщил на пресс-конференции в Минске председатель Верховного суда Беларуси Валентин Сукало.

В текущем году, по его словам, трое человек были приговорены к пожизненному заключению, в одном случае суд вынес смертный приговор. В минувшем году "в связи с рассмотрением некоторых групповых очень тяжких преступлений — дела "Банды Морозова" и других — было вынесено 4 смертных приговора", — уточнил В.Сукало.

"То, что в течение этого года вынесен один смертный приговор, означает, что мы подошли к практическому мораторию на применение смертной казни и психологически готовы к этому", — сказал председатель ВС. При этом он призвал не забывать, что данный вопрос выносился на референдум, и большинство граждан республики поддержали существование такого вида наказания, как смертная казнь.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ПАМЯЦЬ

Артур Вольскі: «Па шчырасці, не па вярбоўцы...»



23 верасня — день нараджэння паэта Артура Вольскага (1924—2002 гг.).

Кнігі аўтара першай дзіцячай аперэты "Сцяпан — вялікі пан", паўтара дзесятка дзіцячых зборнікаў выходзілі ў перакладах на англійскую, нямецкую, польскую і іншыя мовы.

Ён любіў Беларусь, шмат падарожнічаў і лічыў, што ў свеце няма лепшай за яе краіны. Гэту любоў ён перадаваў сваім вучням у школе, дзе працаваў апошнія гады выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры.

Артур ВОЛЬСКІ

Мова

Не ў мёртвых рысках на васкоўцы
яна прыйшла, а ў роднай песні.
Я ўдзячны вам, сябры-вяскоўцы,
што мову да мяне данеслі,

што мне не трэба, як знаходку
часоў былых,
парой начною
разгадваць тайну мовы продкаў.
Яна пры мне,
ўва мне,
са мною.

Як родны край, на выгляд сціплы,
яна ў сабе хавае скарбы.
І гнеў,
і сум,
і жарт дасціпны,
і шчасця радасныя фарбы
даступны ёй.
А ці б маглі мы
дакладней выказаць прызнанні
ў любві —
да маці,
да Радзімы,
і да адзінай —
у каханні?
Праз перашкоды забаронаў
яна прыйшла жывой
і спраўнай,
пакуль зрабілася законнай,
пакуль зрабілася дзяржаўнай.

Ёй —
самароднай,
самай роднай —
ні крыўдай нізкай,
ні апіскай
не здраджу.
Самай неабходнай
яна мне стала.
Самай блізкай.
Па шчырасці, не па вярбоўцы
служу аддана роднай песні.
Я ўдзячны вам, сябры-вяскоўцы,
што мову да мяне данеслі.

Падрыхтаваў Сяргей ШАМІЁНКА.
Мінск.

ПАМЯЦЬ

Служыў беларушчыне

ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" выпусціла юбілейны каляндарык, прысвечаны аўтару першага слоўніка беларускай мовы Івану НАСОВІЧУ. 7 кастрычніка споўніцца 220 гадоў ад дня ягоных народзінаў.

Выява Івана Насовіча змешчана на фоне Мсціслаўскага кармеліцкага касцёла, помніка беларускага барока XVII—XVIII стагоддзяў. Ураджэнец Магілёўшчыны, мовазнаўца, фалькларыст і этнограф значную частку свайго жыцця пражыў у Мсціславе, дзе і напісаў згаданы слоўнік.

...Каляндарная сетка выдання ТБМ складзена на 2008—2009 навучальны год і будзе прыдатная для карыстання вучням і студэнтам. Дызайн выканаў мастак Ігар Марачкін. Запытвайце памятны кішэнны каляндарык у сядзібе ГА "Таварыства беларускай мовы", што на вуліцы Румянцава, 13, у Мінску, і ў сядзібе Партыі БНФ на пр.Машэрава, 8.



Ірына МАРАЧКІНА.

РЭГІЁН

Лекарка Фядора стала спонсарам сельсавета

За грошы 80-гадовай бабулі бялыніцкая ўлада нарэшце пабудуе агароджу на вясковым пагосце. Хоць ён — на тэрыторыі "аграгарадка"...

Фядора Канюхова — самая вядомая ў Беларусі народная лекарка. Жыве яна ў вёсцы Пільшычы Бялыніцкага раёна.

Тэлефаную старшыні Цяхнінскага сельсавета Мікалаю Шакуру, цікаўлюся, ці не спраўдзіў ён сваю задуму добраўпарадкаваць Пільшычы. Нагадваю пра даўнія праблемы. Кажу: памятаю, як асабліва прыкра выглядалі тамтэйшыя могілкі. Яны яшчэ даваеннага часу. Помнікі ўраслі ў траву. Ад вясны між магіламі бадзяюцца козы ды каровы. Вецер абломвае з вялізных дрэў галіны. Яны гніюць у кучах.

На пытанні Мікалай Шакура адказвае не адразу. Перадусім інфармуе, што ўсе ягоныя сілы і фінансы былога калгаса, а цяпер ААТ "Новая Друць", высмоктвае будаўніцтва аграгарадка ў Цяхніне.

— У нас цяпер, як у райцэнтры, — кажа Мікалай Шакура, — школа-сад, амбулаторыя, бібліятэка, гандлёвы цэнтр, аўтаматычная тэлефонная станцыя. Пачаў працаваць новы жывёлагадоўчы комплекс на 800 кароў. Агульны кошт аб'екта — 6,3 млрд рублёў.

Ля аграгарадка Цяхнін месцяцца амаль закінутыя вёскі Прыбар, Асмолаўка, Асман-Касаева, Вугольшчына і Пільшычы. Пытаю ў старшыні, ці нельга было "адшпіліць" ад мільярдных выдаткаў хоць нейкія капейкі на паляпшэнне дабрабыту ў ваколіцах?

— На гэта скарыстоўваем добраахвотныя сродкі. Вось, дзякуй, бабуля Фядора ахвяравала паўтара мільёна. Будзем ставіць агароджу на вясковых могілках у вёсцы Пільшычы...

Фядора Данілаўна не падтрымлівае мае закіды пра бедны сельсавет. Яна крыўдуе на савецкую ўладу, кажа, што тая пераважна і зрабіла амаль бязлюднымі Пільшычы, дзе, па яе словах, было раней спрыяльнае для людзей "царкоўнае месца".

— Тут мой дзед працаваў ваенным хірургам, а бабуля лячыла пад гіпнозам тутэйшых насельнікаў і прыезджых у лякарні тутэйшага пана. Я патраціла практычна ўсё жыццё, каб даказаць, што ля дзедавага дома струменяць гаючыя крыніцы. Таму тут гліна і вада — гаючыя. Я імі шмат хворых вылечыла. А ўлады мне толькі перашкаджалі...

Спонсарам сельсавета лекарка Фядора стала паводле аднаго са сваіх запаветаў: "Менш гаварыце, а больш рабіце. Не давайце голых абяцанняў, не пускайце язык свой у хаду куды не трэба".

Галіна БАРАВАЯ.

ПОСТАЦІ

«...Бо лепш незламаным памерці, чым жыць з перабітым крылом»

25 верасня найвыдатнаму паэту, былому вязню ГУЛАГа Сяргею Грахоўскаму (1913—2002) было б 95 год

Аднойчы — тое была яго перадапошняя восень — Сяргей Іванавіч патэлефанаваў: "Хачу паказаць адну рэч, якую даўно ад сябе самога хаваю". Сустрэліся ля яго пад'езда, селі на лаву пад разгалістым клёнам, з якога абляталі апошнія лісты. Ён моўчкі дастаў з унутранай кішэні курткі і працягнуў мне невялікі блакноцік у шурпатым цёмнашэрым, пад колер зямлі, пераплётам. Ад хвалявання ў мяне дрыжэлі рукі: у якіх жа пераплётах пабываў гэты самы пераплёт разам з яго змесцівам і самім гаспадаром! Як ім — абодвум — удалося ацалець у тыя гулагаўскія гады? Схаваць тайну ад пільных назіральшчыкаў пры найстражэйшай забароне не тое што любога пісання — нават чыстага шматка паперы ці аловачнага зломка...

— Знайшлі б — не размаўлялі б мы зараз з вамі. Самому не верыцца, што ўдалася такая "афера". Ну, ды гэта асобная гісторыя, — сказаў ён і надоўга змоўк.

Я гартала спісаныя ўборыстым, драбнюткім почыркам лісткі з вершаванымі радкамі, працятымі болем і пакутай. Не за сябе — за Радзіму. Ішла вайна, родная зямля была ў агні — а ён тут, удалечыні ад яе, звязаны па руках і нагах, пазбаўлены найвышэйшага права бараніць самае дарагое ад захопнікаў-чужынцаў. І над усім — неадольная вера ў Перамогу над фашызмам, у будучыню Айчыны. Яна давала сілы выжыць там, дзе жыць было немагчыма.

І гэта пісаў "вораг народа"?! І вось такіх "ворагаў" — сапраўдных патрыётаў, высакародных і перакананых — мільёнамі асуджалі на пагібель, кідалі за калючы дрот, вялі на расстрэл?

— Сяргей Іванавіч, дык жа гэты блакнот — важкі доказ вашай невінаватасці, чаму не прад'явілі яго хаця б пры другім арышце?

— А каб горай не было, — усміхнуўся ён, дзівячыся майму здзіўленню.

На дварэ ўсё халаднела, калючы вецер кідаў у твар пажоўклую лістоту. А ён і не зважаў, заглыбіўшыся ў свае думы: ці такую халаднечу зведаў?

Аб чым думаў у гэтыя хвіліны, што згадваў?

Можа быць, вяртаўся ў поўную шчаслівых надзей, бурлівую маладосць, калі з такімі ж, як ён, вясковымі хлопцамі-рамантыкамі, што прыйшлі ў 20-я гады ў паэзію і з усёй палымянасцю апявалі "новую яву", а потым апынуліся ў адной камеры, прайшлі праз нечалавечыя мукі ў лагерах, высылках, гінулі пакутніцкай смерцю?

А можа, бачыў такі ж кастрычніцкі дзень далёкага 1936 года, калі, вяртаючыся дадому з працы ў Радыёкамітэце, адчуў нешта нядобрае? У пакоі, дзе быў учынены страшэнны вэрхал і ламала рукі заплаканая цяжарная жонка, яго чакалі энкавэдысты. Ужо ў "варанку" з тугой глядзеў, як аддаляецца агеньчык у родным акне, ды не верыў, што ніколі-ніколі не вернецца сюды, не ўбачыць каханую жанчыну і будучае дзіця: выкінутыя проста на вуліцу, на згубу, яны дзесьці згінулі ў невядомасці...

Ці, можа, з горыччу ўзгадваў сваю тагачасную, зараз смешную ўпэўненасць, што, паколькі ён ні ў чым не вінаваты, там дзе трэба хутка разбяруцца, папросяць прабачэння за памылку і выпусцяць на волю. Не губляў надзеі нават тады, калі апынуўся ў адзіночцы "амерыканкі" — жудаснай турмы ў двары будынка НКУС, цярпеў гнюсныя здзекі, пакутлівыя начныя допыты і цынічную "шчырасць" следчага: "Шлёпнем цябе, вось табе і следства і суд. Лепш прызнавайся ў контррэвалюцыйнай трацкісцкай дзейнасці!"

Потым будуць першыя дзесяць доўгіх год лагернага пекла, затым у 1946-м — вызваленне з "воўчым білетам" пад нагляд "у сельскую мясцовасць". А ў 1949-м — яшчэ аддыхацца не паспеў — новы арышт. І знаёмы да болю стыль панявольшчыкаў, ператрус у хаце пад пагрозлівы крык: "Не прикидывайтесь! Показывайте, где прячете белорусские книги!"

Зноў — па этапу, у Сібір, праз асуджэнне на бестэрміновы "рай"...

Той кляты досвед адным разам, ужо ў апошнія гады, саслужыць яму добрую службу. Помню, з гумарам распавядаў Сяргей Іванавіч пра прыгоду ў парку Чэлюскінцаў, дзе любіў гуляць самнасам па ціхіх, малалюдных сцяжынках. Неяк надвячоркам з-за кустоў высыпала зграя шпаны. Хуліганістыя маладзёны ўзялі ў ціскі старога чалавека, сталі пацвельвацца, штурхаць, лапаць кішэні, пагражаць. А ён і не думаў клікаць на дапамогу ці бараніцца, хоць, нягледзячы на гады, мог бы пры сваім росце і фізічнай загартоўцы пакласці на зямлю не аднаго. Ён толькі адкрыў рот — і першы і апошні раз у жыцці — выдаў порцыю такой махровай лагернай "фені", чутай тысячу раз ад панявольшчыкаў, што цяперашнія нападнікі на імгненне аслупянелі, а ў другое імгненне кінуліся ўрассыпную з крыкам:

— Ратуйся! На пахана нарваліся!

...Толькі ў 1956-м, пасля смерці Сталіна, разам з мноствам бязвінных, цудам ацалелых ахвяр масавых рэпрэсій ён нарэшце атрымае волю, поўную рэабілітацыю і назаўжды вернецца на родную, любую, дарагую ў радасці і бядзе беларускую зямлю. Праз цэлых дваццаць скрадзеных, знявечаных, спляжаных маладых год вернецца да жыцця і, нібыта даганяючы незваротна страчаны час, напоўніць адпушчаныя Богам гады ледзь не "атамным" выбухам духоўнай і творчай энергіі, прагай усё ўбачыць, паспець, сказаць. Вернецца незламаным і нескароным, захаваўшы ў неверагодных выпрабаваннях трапяткую і мужную душу, сумленне, годнасць, ясны розум. І, асэнсоўваючы і пераасэнсоўваючы перажытае на ўсіх кругах пекла, будзе шукаць — і знойдзе! — адказ на неадступнае пакутлівае пытанне: "За што? Чаму? Каму гэта трэба?" Паступова, крок за крокам ён будзе ўсё глыбей спасцігаць трагедыю, што адбылася з ім самім і ўсёй краінай. І з безабароннай ахвяры бязлітаснай рэпрэсіўнай машыны стане суддзёй, закляйміць пайменна ганьбай і праклёнам не толькі "ўласных" катаў і садыстаў — вынесе суровы прысуд бесчалавечай сістэме таталітарызму.

Аб гэтым з пераканаўчай сілай ён паведае ў дакументальных аповесцях-споведзях "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія сцягі", у шматлікіх вершах, публіцыстычных творах. Паведае з адчуваннем сваёй чалавечай і мастакоўскай місіі — і за тых, хто не вярнуўся, і для тых, хто нізавошта не павінен дапусціць такое.

Ён меў поўнае права сказаць пра сябе: "Я двойчы прайшоў усе кругі пекла і не зламаўся, не знік на таежных скрываўленых трасах... Я бачыў усё і ўсё перажыў. Лёс злітаваўся і наканаваў мне жывым выйсці з пекла і стаць Сведкам на Судзе Гісторыі... Памятаю ўсё да драбніц і клянуся кожным словам, кожным радком гаварыць толькі праўду, каб ведалі людзі і ніколі не далі сябе ашукаць прыгожай хлуснёй і д'ябальскім каварствам. Сведчу, каб нашы нашчадкі спазналі сапраўдную волю, роўнасць і шчасце на роднай акрыялай і расквітнелай зямлі".

Перабольшання не будзе: паэт Сяргей Грахоўскі здзейсніў грамадзянскі подзвіг суровай праўдай аб трагічных старонках гісторыі Айчыны. Ён рабіў тое, што і Ларыса Геніюш, а ў рускай літаратуры — нобелеўскі лаўрэат Аляксандр Салжаніцын. Лепшае з яго пісьменніцкіх сведчанняў на судзе гісторыі (рэальны суд у грамадстве яшчэ так і не адбыўся) увайшло ў кнігу "Выбраныя творы", што летась убачыла свет у выдавецтве "Беларускі кнігазбор" пільным клопатам дачкі Сяргея Іванавіча Таццяны Сяргееўны і аўтара праекта Кастуся Цвіркі. На жаль, вершаў з таго, згаданага мною лагернага блакноціка там не аказалася: неацэнны, унікальны рарытэт у сямейным паэтавым архіве, як ні шукала спадарыня Таццяна, знайсці не ўдалося.

Зразумела, салідны, ёмісты том не змог — ды і не мог — змясціць нават малую частку плёну ўладальніка шматграннага таленту, які нёс людзям здабыты на зломе лёсу дар насуперак дваццацігадовай зоне маўчання... Адзін за другім выходзілі яго зборнікі "І радасць і боль", "Споведзь", "Вячэрні звон", "На апошняй вярсце", "Недапісаная кніга" і шмат іншых, дзе побач з мастакоўскім роздумам аб мінулым, сучасным і будучым Бацькаўшчыны, побач з прасякнутымі болем і горыччу радкамі — узоры дзівоснай лірыкі, парыванні чулай, пяшчотнай душы, уваскрашэнне прыгожых і сонечных імгненняў. На сваім пакручастым шляху паэт сустрэў вялікае шчасце — верную, адданую да скону дзён Валянціну Міхайлаўну — яго анёла і музу, яго радасць і дыханне. Гэта яна, "дзекабрыстка" савецкай эпохі — маленькая, танюткая, як былінка, ды з адважным, поўным любові сэрцам — прабіралася начной нязведанай тайгою за канвоем, якім гналі яе мужа ў няволю. І — дагнала, і абняла яго! І стала да апошніх дзён неадлучнай, пайшоўшы ўслед за мужам у хуткім часе ў іншы, незямны свет...

Паэт класічнай традыцыі і класічнай сілы, Сяргей Грахоўскі пакінуў нам і нашым нашчадкам надзвычай багатую спадчыну, якая — можна сказаць упэўнена — не будзе ляжаць мёртвым грузам. Бо яна — жывая! У ёй не толькі гісторыя, а і тое, чым мы жывём, хвалюемся сёння, чаго прагнем усёй душой. У кожным радку, чаканным і афарыстычным па форме, — гарачая малітва за Беларусь і ахвярнасць дзеля яе... Знойдзеныя ў глыбіні сэрца словы бяруць у палон напалам паэтава пачуццё і сугучнасцю пачуццям многіх сучаснікаў. Таму і хочацца паўтараць і паўтараць, завучваць на памяць ну хаця б гэтыя радкі:

Лепш рынуся ў шал крутаверці,
Нягодам пайду напралом,
Бо лепш незламаным памерці,
Чым жыць з перабітым крылом.

Ён і застаўся такім — незламаным!

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

Увазе чытачоў — нізка вершаў з кнігі "Выбраныя творы" (2007 г.)

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Вершы розных гадоў

Дубовы ліст

Стаяць дубровы ў жнівеньскай красе,
Ляцяць у вырай жураўлі і гусі,
Дубовы ліст, у жылках і ў расе,
Мне нагадаў абрысы Беларусі.

Яго мая кранаецца рука,
А ён нібыта выкаваны з броні,
І жылка кожная дубовага лістка
Злілася з жылкамі маёй далоні.

1962

***

Як я жыў без цябе?
І не ведаў, што недзе на свеце,
За глухімі лясамі,
За сотнямі ўзгоркаў і меж,
Не на дальнім сузор'і,
А у нас на планеце
Ты ў зялёным і ціхім
Завулку жывеш.

Як я жыў без цябе?
А маглі ж не сустрэцца ніколі,
За паўкроку
Адно аднаго абмінуць,
Разысціся,
Як сцежкі расходзяцца ў полі,
І не знаў бы,
За страту каго папракнуць.

Мабыць, трэба было
Праваліцца у пекла,
Траціць блізкіх,
Пакутаваць, мерзнуць, гарэць,
Ратавацца,
Каб лютая сцюжа не ссекла,
Каб цябе пад Палярнаю зоркай
Сустрэць. І пазнаць,
І адразу забыцца аб крыўдзе,
Каб убачыць праменьчыкі
Ў зрэнках тваіх,
Нарадзіцца ізноў
І паверыць, што прыйдзе
І збавенне, і шчасце
Адно на дваіх;
Падабрэць, памякчэць,
Назаўсёды скарыцца
Непадкупнай
Суровай тваёй чысціні,
Каб істоты тваёй
Адкрываць таямніцы,
Каб душу гартаваць
На высокім агні.

Час ляціць і ляціць,
Завіруха завеяла скроні,
Пакідаюць насечкі
Гады на ілбе.
Я гляджу на цябе,
Я дзіўлюся і сёння,
Чым я жыў без цябе,
Як я жыў без цябе?..

1965

19 кастрычніка

Здрабнелі зоркі ў тую ноч,
І месяц заблудзіўся дзесьці.
Мяне вядуць у змрок, а воч
Ніяк ад дому не адвесці.
Яшчэ зірнуў апошні раз
І ад пакуты аж заенчыў,
Калі ў маім акне пагас
І без таго слабы агеньчык.

Шумела лісце, дождж імжыў,
У сцены біўся вецер з гулам.
І з гэтае хвіліны жыў
Я не ў наступным, а ў мінулым.
Паўзла дарога, як змяя,
Пранізваў холад мозг і цела,
І знічка ранняя мая
У чорным небе праляцела.

І след яе адразу знік
На заімглёным небакраі,
Не замаўкаў над намі крык
Начное крумкачынай зграі.
Вязуць. Не ведаю куды,
І так прыспешваюць таропка.
Няўжо у дваццаць тры гады
Лёс і на мне паставіў кропку?

Вязуць па вуліцах пустых,
Я не ў сваёй, а ў іх уладзе.
Мутнее зрок, тупее слых,
У думках — поўнае бязладдзе,
Не мог тады я зразумець
Той таямнічае работы,
Што будуць дваццаць год рыпець
І па душы таптацца боты.

Як толькі ўспомню чорны год
І ноччу страчаную волю,
Астудзіць спёка, быццам лёд,
Завея апячэ да болю.
Дажыў я ўсё ж да сівізны,
Як ні ламалі, ні малолі,
А вось сябры маёй вясны
Дамоў не вернуцца ніколі.

За імі спалены масты,
І сцежка даўняя глушэе,
Крышталь адвечнай мерзлаты
Аздобіў брацкую траншэю.
Яе карэнні аплялі
І дол сціскае невыносны.
Каторы год на той зямлі
Гайдаюцца над імі сосны.

А я жыву. І вось ізноў
Гляджу, як з клёна лісце льецца.
Паклічу ў госці ўсіх сяброў.
Хоць і ніхто не азавецца.
Пабачылі б яны хаця
Наш новы дзень, і свет зялёны,
І вернутыя з забыцця
Святых пакутнікаў імёны.

[1987]

Душа

Мяне выхоўвалі,
Мяне захоўвалі,
Я то з'яўляўся,
То знікаў,
Мяне вадзілі
І ахоўвалі,
Хоць я нікуды
Не ўцякаў.

І пад замкамі,
І пад пломбамі,
Нібы каштоўнасць,
Бераглі
І неба клеткамі
І ромбамі
Разлінавалі,
Як маглі.

Мяне узважвалі і мералі,
Здымалі
Ў профіль і анфас,
Але ні разу
Не праверылі
Душы наяўнасць
І запас.

Шкада,
Што не здымаюць копію
З яе юрысты
І ўрачы,
І ні адна дактыласкопія
Не можа тут дапамагчы.

Мая душа
Супраціўлялася,
Бо верыла і тым жыла,
І не чарсцвела,
Не ламалася —
Была такою, як была.

Хоць дзіўна,
Ў чым яна трымалася,
А паспрабуй
Яе сагні!
Яна ж з маленства
Гартавалася
На чыстым,
Праведным агні.

1964

Рэквіем рукапісам

Казалі — рукапісы не гараць,
А я аднойчы бачыў, як гарэлі
У печы Галубковы акварэлі,
Як вершы адпраўлялі паміраць,
Сагрэтыя яшчэ жывым дыханнем,
І ласкаю, і трапяткім каханнем,
А кажуць — рукапісы не гараць.

І як яшчэ гараць! І колькі іх згарэла
У печах патаемнага двара,
Што зеўралі, як д'яблава нара,
Душа паэм навекі адляцела,
Што так дайсці да кожнага хацела
Пасланцам весялосці і дабра,
Ды знікла ў полымі казённага кастра.

Не стануць рукапісы кнігамі ніколі,
Не дакрануцца чулае душы,
Халодны попел як ні варушы,
Што датляваў па дзікай волі,
З вятрамі знік ён у бязлюдным полі,
Якое не засеяць, не ўзараць...

А кажуць — рукапісы не гараць.

[1987]

Народ

Мы адзіныя, мабыць, на свеце,
Што забылі, як маці завуць.
Так і нас адцураюцца дзеці
І нялёгкі свой век дажывуць.

Нам не раз падсякалі асновы,
Выстаўлялі святыні на здзек,
Але матчына мудрае слова
Пераходзіла з веку у век.

Хто ж нятленную памяць нанова
І таптаў, і развейваў у прах?
І сумленне, і годнасць, і мову
Адымалі няволя і страх.

У душы незагойныя болькі
Развярэдзіў разбэшчаны зброд...
Мы насельніцтвам станем, і толькі,
Калі з моваю знікне народ.

[1990—1991]

Вячэрняя малітва

Да поўначы, укленчыўшы, хрышчуся,
У неба, у зорак і ў Бога малю
Даць волю і долю маёй Беларусі,
Вярнуць нашу мову, душу і зямлю.

Даўно мы знямелі, аглухлі, аслеплі,
Зайшоўся ад болю і голас, і зык,
Нас прыхадні гналі пад кулі і ў петлі
І вырвалі ў нашага Бога язык.

А Бог уваскрос, і жывы, і нязводны,
Распяты не раз без адходнай імшы,
У памяці нашай, у долі народнай,
У кожнай жывой акрыялай душы.

Зацятыя прыхадні енку не чуюць,
Бо ведаюць толькі: "крышы" і "карай"!
Пагардай і лютай знявагай лінчуюць
І мараць пра "Северо-Западный край".

Яго нашы продкі і мы паспыталі,
Але не здаліся пякельнай бядзе:
Прарока нам Бог дараваў на Купалле,
Каб ён запытаўся: "А хто там ідзе?"

О, Божа магутны, малю і малюся:
Спрадвечныя нашы пакуты згадай,
Хоць ты заступіся за лёс Беларусі
І згінуць не дай.

30 чэрвеня — 3 ліпеня 1992 г.

Мой лепшы твор

Дачцэ Тані

За Уралам, за белай тайгою
Кожнай шыбай, зашклёнай ільдом,
Пазірае ў завею з тугою
Мной калісьці пастаўлены дом.

Хтось рыпучыя топча масніцы,
Замятае на ганку сляды,
І нікому цясляр не прысніцца
У пару і пакут, і бяды.

Кожны вугал трашчыць на марозе,
Вецер свішча ў расколах тайгі.
Хто ж ступае па хісткай падлозе,
Я гадаю у вечар даўгі.

І прыпомню стажок за павеццю,
Завірухай замецены двор,
І шчаслівы, што некаму свеціць
Мой найлепшы завершаны твор.

29 студзеня 1997 г.

АДУСЮЛЬ

Са школьнікаў збіраюць па пяць бульбін

Акцыю "5 бульбін" праводзіць у Баранавічах дзяржаўная ўстанова "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва".

Яго супрацоўнікі разаслалі ў школы горада лісты на імя кіраўнікоў устаноў адукацыі, у якіх просяць, каб у прызначаны імі дзень кожны школьнік прынёс па пяць бульбін. Робіцца гэта "з мэтай аказання дапамогі людзям сталага веку ў нарыхтоўцы бульбы на зіму". Адзначым, што акцыя праводзіцца ў горадзе напярэдадні Дня сталых людзей, які адзначаецца 1 кастрычніка. Але ў год, калі ў краіне сабраны самы вялікі ўраджай, многім ініцыятыва дзяржустановы падаецца недарэчнай.

Замест галандскай травы — грыбы

Грыбы выраслі на магілёўскім стадыёне "Спартак".

Не паспелі на ім да канца пакласці новы газон, як давялося яго скручваць. Пакрыццё, якое было выгадаванае ў Смалявічах для футбольнага поля, забракавалі спецыялісты.

А цяпер прыбіраць можна не толькі траву, але і грыбы, якія паспелі тут вырасці. Пра гэта паведаміла газета "Магілёўскія ведамасці".

Дарэчы, для набыцця шматгадовай травы з галандскага насення было выдзелена 56 мільёнаў рублёў. Цяпер яе прыбяруць і будуць чакаць новага газона, на гэты раз з расійскага Валгаграда.

Самы дарагі ігрок БАТЭ каштуе мільён еўра

Гэта, паводле разлікаў партала transfermarkt.de, Ігар Стасевіч.

Далей ідуць Зміцер Ліхтаровіч — 800 тысяч еўра, Генадзь Блізнюк — 500, Максім Жаўнерчык — 450, Віталь Радзівонаў і Зміцер Платонаў — па 400.

А ўвесь склад барысаўскага клуба каштуе 5 мільёнаў еўра. БАТЭ — самая танная каманда сярод удзельнікаў сёлетняй Лігі чэмпіёнаў. Нават футбалісты кіпрскага "Анатросісу" каштуюць утрая даражэй.

Ахвяры цеплатрасы ў Гродзенскім заапарку

У выніку аварыі цеплатрасы, якая адбылася ў Гродзенскім заапарку, загінулі 2 ваўкі.

Факт смерці пацвердзіла дырэктар установы Цэліна Пагерыла. Шэраг жывёлін атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Па папярэдніх даных, аварыя цеплатрасы адбылася па тэхнічных прычынах, адной з якіх з'яўляецца знос абсталявання. На працягу доўгіх гадоў трубы не мяняліся, у выніку чаго ржа нанесла непапраўныя пашкоджанні, якія і прывялі да трагедыі. Так лічыць галоўны інжынер гродзенскіх цеплясетак Генадзь Давідовіч.

Увага!

У Мінску з 1 кастрычніка бягучага года ў мікрараёнах "Сухарава" і "Уручча" змяняецца рух грамадскага пасажырскага транспарту.

У прыватнасці, будзе закрыты рух аўтобусных маршрутаў №118 "Сухарава-6 — ДС "Кунцаўшчына" і №151 "ДС Уручча-4 — Рагачоўская". Аўтобусны маршрут №17 "Сухарава-6 — ДС "Кунцаўшчына" будзе рухацца па вул.Кунцаўшчына, вул.Лабанка, вул.Мазурава, вул.Шаранговіча, вул.Акадэміка Фёдарава, вул.Панчанкі.

ПСИХОЛОГИЯ ДЛЯ ВСЕХ

Критический возраст

"С меня при цифре 37 в момент слетает хмель", — пел Владимир Высоцкий. Но роковой для самого поэта стала цифра 42 — в этом возрасте он ушел из жизни

Кризисная психология

Еще в прошлом веке ученые обнаружили некоторую закономерность: многие известные люди умирают или погибают в определенном возрасте. Цифра 37 оказалась роковой для Байрона, Пушкина, Маяковского. Потом опасный рубеж сместился на отметку 42. Именно в этом возрасте ушли Шукшин, Джо Дассен, опять же Высоцкий. Почему? Существует ли некая обусловленность судьбы?

— В современной науке есть такое понятие — "кризисная психология", — рассказала автору этих строк заведующая кафедрой психотерапии Белорусской медицинской академии последипломного образования Ирина Байкова. Выделяются три типологических вида кризисов в жизни человека: кризисы, связанные с реакцией на стрессовые ситуации, кризисы становления и кризисы развития. Примерно после 30 лет наступает период подведения первых итогов своей жизни. Однако наиболее ярко, отчетливо это происходит после 40 лет, при наступлении так называемого кризиса середины жизни. Человек четко осознает, что жизнь не бесконечна, пытается дать оценку сделанному, достигнутому им, осмыслить цель своего земного существования. Данный кризис в большей, нежели у 30-летних, степени характеризуется философски окрашенной составляющей.

На это зачастую накладывается, как говорят ученые, духовный кризис личности: конфликт поколений, выхолащивание семейных отношений и тому подобное. А у эмоционально неустойчивых людей (именно к таковым относятся поэты, писатели, артисты, художники) творчество настолько спаяно с личностью, что когда иссякает внутренний источник жизнедеятельности, как бы утрачивается и собственное "я" — теряется смысл жизни. Человек начинает нервничать и порой лихорадочно менять сферу деятельности. Байрон вдруг подается в карбонарии, потом идет воевать за свободу Греции. Пушкин пробует заняться историей. Его внутренняя тревога также находит выход в ревности. За последний год своей жизни поэт дрался на трех дуэлях, как будто сам искал смерти...

Некоторые психологи утверждают, что в подобном состоянии человеку не жалко себя — отказывает механизм самосохранения. Он может пристраститься к спиртному, наркотикам. Спасти может лишь саморегуляция. Иногда действительно полезно сменить сферу деятельности. Например, перейти от творческой к преподавательской по примеру Льва Толстого, который, как известно, стал учить ребятишек.

Прошлое догнало и убило...

И все-таки, почему фатальная цифра 37 впоследствии превратилась в 42? Версия такова. У мужчин, в частности, начала позже наступать социальная и психологическая зрелость. Возьмем, к примеру, XIX век: в 16 лет юноша уже гусар на коне, в боях; к 25 — полковник, а то и генерал; после 30, скажем образно, — старик. Один из наполеоновских маршалов, Ланн, говорил: "Гусар, который не погиб в 30 лет, не гусар, а дерьмо".

В наши же дни вследствие увеличения средней продолжительности жизни, а также периода подростковой "невзрослости", жизнь, по утверждению психологов, как бы растянулась. Они советуют: нынче только после 30-летнего возраста целесообразно жениться, заводить детей, всерьез заняться семьей. Или резко изменить свою жизнь, как это сделал Джон Леннон, который все глубже погружался в наркоманию. Он нашел в себе силы уйти со сцены и пять лет не появлялся на публике. А затем выпустил диск "Duble Fantasy", ставший очень популярным. К сожалению, Леннона убил фанатик. Однако близкие люди уверены: убило артиста прошлое. Догнало и убило...

Ломать голову — хуже нет

Между тем кризис развития у мужчин и женщин различен. У мужчин гораздо легче протекает период, связанный с гормональной перестройкой организма. Но женщины психологически более плавно переносят время критического возраста. К тому же выросли дети, стало больше свободного времени. А вдруг еще можно иначе, лучше устроить свою судьбу? Меняется и ролевая ситуация в семье. Женщина чувствует, что многое, в первую очередь материальное благополучие, да и влияние на повзрослевших детей зависит теперь от мужчины. И тоже начинает меняться. Кто-то из женщин осваивает новую профессию, кто-то заводит роман на стороне. В этот период специалисты советуют посвятить себя общественной работе.

Некоторые психологи на вопрос, что еще конкретно можно порекомендовать человеку, оказавшемуся в кризисе, отвечают: то же, что еще в XIX веке советовали опытные народовольцы новичкам, попавшим в тюрьму, — не опускаться! Делать зарядку, умываться, чистить зубы, в общем, держать себя в форме. В этом есть определенный психотерапевтический смысл. А ломать голову — хуже нет...

P.S. *С точки зрения доцента Ирины Байковой, духовные жизненные кризисы хотя и тяжело переносятся, в целом как бы предназначены для того, чтобы человек стал лучше, сильнее. Их лечить не надо. Мы в состоянии сами, с помощью внутренних ресурсов все преодолеть и в итоге стать более совершенными, гармоничными.*

Игорь ГРИШАН.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

У дэкрэтным адпачынку працаваць не забаронена...

Да выхаду ў дэкрэтны адпачынак я працавала ў прыватнай фірме. Так атрымліваецца, што ў мяне ёсць магчымасць зараз падпрацоўваць у іншым месцы. Падкажыце: ці маю я на гэта права па законе?

Святлана Цімафеенка, Гродна.

— Так, працаваць вы можаце, закон вам гэта не забараняе. У Працоўным кодэксе запісана: "Па жаданні асобы, якая знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе за дзіцем, яна можа працаваць на асноўным ці іншым месцы працы на ўмовах няпоўнага працоўнага часу (не больш за палову месячнай нормы працоўных гадзін) і дома з захаваннем штомесячнай дзяржаўнай дапамогі".

Адпачынак па доглядзе за дзіцем да дасягнення ім трохгадовага ўзросту, дарэчы, уключаецца ў агульны працоўны стаж.

Для тых, хто хоча есці па начах...

Сваю працу я заканчваю вельмі позна. І звычайныя прадуктовыя магазіны ўжо зачынены. Падкажыце, колькі магазінаў у Мінску працуюць па начах і дзе яны размяшчаюцца?

Сяргей Рымша, Мінск.

У сталіцы ёсць некалькі магазінаў, якія працуюць з пакупнікамі ў начны час. Вось іх адрасы: магазін "Прэстан" — вуліца Багдановіча, 153, яшчэ адзін начны "Прэстан" размяшчаецца па адрасе — пр.Машэрава, 25, гандлёвы цэнтр "Палессе" на пр.Ракасоўскага, 62, універсам "Першамайскі" — вуліца Русіянава, 7, гандлёвы цэнтр "Карона" (працуе да 2 гадзін ночы) — вул.Кальварыйская, 24.

Яшчэ адзін начны магазін размяшчаецца ў будынку чыгуначнага вакзала.

Тэлефануйце за чужы кошт

У сталічных аўтобусных маршрутах часцяком гучыць сацыяльная рэклама: маўляў, калі вам неабходна тэрмінова патэлефанаваць, то можна бясплатна скарыстацца паслугамі таксафона. Я спрабаваў. Але нічога не атрымліваецца. Чаму?

Мікалай Халадзінскі, Мінск.

— Адразу варта адзначыць, што бясплатна пазваніць з мінскага таксафона не атрымаецца, як бы ні хацелася.

У выпадку, калі вам неабходна кудысьці датэлефанавацца, а грошай на мабільным тэлефоне ці ў кішэні зусім няма, то размова можа адбыцца толькі за кошт абанента, якога вы выклікаеце. Для таго каб пагаварыць за чужы кошт з тэлефона-аўтамата, трэба набраць кароткі нумар 8—11. Вам адкажа аператар "Белтэлекама". Яму трэба паведаміць нумар тэлефона абанента, які выклікаецца, сваё імя і імя чалавека, з якім вы збіраецеся пагутарыць. Аператар звяжацца з вашым абанентам і запытаецца, ці згодны той размаўляць з вамі за ўласны рахунак. Калі будзе атрымана згода, то вам пагутарыць удасца, а калі абанент, з якім вы хочаце пагаварыць, праявіць сквапнасць, то размова не адбудзецца...

Банкаўскі працэнт не вылічваецца...

Толькі што аформіла сабе пластыкавую картку "Беларусбанка". Падкажыце, калі ласка: які працэнт за паслугу бярэ сабе банк пры зняцці грошай праз банкамат?

Наталля Разумовіч, Мінск.

— За зняцце наяўных грашовых сродкаў са "станоўчага" балансу рахунка з выкарыстаннем банкаўскай пластыкавай карткі "Беларусбанка" плата за зняцце наяўных грошай не бярэцца ў банкаматах "БПС-Банка" і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Таксама ніякая "банкаўская ўзнагарода" не здымаецца пры аплаце карткай камунальных плацяжоў праз аддзяленні "Белпошты". Праўда, пры ўмове, што на паштовым аддзяленні месціцца плацежнае абсталяванне менавіта "Беларусбанка".

Інваліды без права на кампенсацыю

Я — інвалід першай групы па агульным захворванні. Падкажыце, ці маю я права на атрыманне грашовай дапамогі на набыццё санаторна-курортнай пуцёўкі і ці магу разлічваць на кампенсацыю за невыкарыстанне гэтай самай пуцёўкі?

Фёдар Гарбенка, Мінская вобласць.

— На сённяшні дзень выплата грашовай кампенсацыі на аздараўленне прадугледжана наступным катэгорыям грамадзян:

— Героям Беларусі, СССР, Сацыялістычнай працы, поўным кавалерам ордэнаў Айчыны, Славы і Працоўнай Славы.

Акрамя таго, на грошы ў гэтым выпадку могуць разлічваць непрацуючыя інваліды ВАВ, удзельнікі ВАВ, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Дапамога на аздараўленне выплачваецца пазначаным катэгорыям грамадзян, якія не выкарысталі сваё права на бясплатнае санаторна-курортнае рашэнне альбо на аздараўленне ў бягучым каляндарным годзе.

Ёсць яшчэ шэраг катэгорый грамадзян, але інваліды першай групы па агульным захворванні на грашовую дапамогу разлічваць, на жаль, не могуць...

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Не спазніцеся!

Лічаныя дні засталіся да пачатку апошняга квартала года, а многія з Вас, шаноўныя чытачы, не аформілі **перадаплату** за кастрычнік—снежань. Каб не застацца без "Народнай волі", зрабіце гэта, калі ласка, у бліжэйшыя дні. Пералічыць грошы, ведаеце, можна праз любы філіял "Беларусбанка" ці праз паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у кастрычніку — снежні — зрабіце гэта за месяц, два...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што **перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

З дапамогай "Народнай волі" разбудзім усіх абыякавых!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 24.09.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №